Валянцін
Мыслівец



# РАСКАЗЫ БОЦМАНА КРАБА



Валянцін
Мыслівец

# РАСКАЗЫ БОЦМАНА КРАБА

З назіранняў марскога падарожніка

МІНСК
«ЮНАЦТВА»
1995

ББК 84 Бел 7
М 95
УДК 882.6-93

Мастак Ю. Ц. ПРАСКУРАКОЎ

Для малодшага школьнага ўзросту

Эта книга — о виденном и пережитом во время странствий по морям и океанам бывалого моряка, о его приключениях, необычных встречах. Автор с большим интересом повествует об экзотических птицах и животных, об удивительном и загадочном мире природы различных уголков нашей планеты.

М $\frac{4803120201 — 066}{М 307(03) — 95}$ 68—93

© В. Ц. Мыслівец, 1995
© Афармленне. Ю. Ц. Праскуракоў, 1995

ISBN 5-7880-0639-2



*Алегу — сыну і сябру*

# ПЕЛІКАН

Зведаў я, дзеці, усе акіяны. Шмат у якіх морах плаваў у шторм і туман. За адвагу і храбрасць на вайне маю ўзнагароды.

У адным толькі паядынку, прызнаюся, струсіў. Адступіў перад птушкай, якую завуць пеліканам.

Магутныя ў яго крылы, шырокі іх размах. Прыгожае апярэнне. Гнуткая шыя. Зоркія вочы. Чырвоны мяшок для палявання на рыб пад доўгай дзюбай. Селяцца гэтыя птушкі ў чаротах, як можна далей ад вока чалавека.

Хуткасць лёту пеліканаў выключная. Пяцьдзесят і болей кіламетраў у гадзіну! А ўзмахі крылаў лёгкія, запаволеныя.

Кормяцца пеліканы рыбай. Узнімаюцца гэтак метраў трыццаць угору, выглядаюць здабычу. Скла-



даюць крылы. Стралою сягаюць уніз. У свой мяшок-сачок пад дзюбай захопліваюць амаль вядро вады з рыбай. Рэзка вынырваюць.

У пелікана пад скурай паветраныя мяшкі. Яны проста выштурхоўваюць птушку з вады на паверхню.

Ваду пелікан выпускае. Спажывае рыбу.

Пеліканы — птушкі таварыскія. Заўважыць каторы з іх рыбны касяк — раздзімае сачок-мяшок, шчоўкае, узмахвае крыламі. Запрашае на лоўлю сваіх суседзяў.

На яйках пелікан і пеліканіха сядзяць пазменна — па трое сутак. А выведуцца птушаняты, дзяжурства становіцца пасутачным. Нібы які механізм кіруе іх паводзінамі.

Пелікан — рэдкая цяпер птушка. Мне ён вельмі запомніўся. Пакінуў во знак над брывом. Гэта не франтавое раненне, як некаторыя думаюць.

А сустрэча з пеліканам адбылася на Чорным моры. Ён любіць цёплыя залівы і ліманы, у якіх водзіцца многа рыбы.

Мы, матросы, любілі здалёк назіраць за пеліканамі. Рэдкаму воку, праўда, даступныя яны на вышыні. Два кіламетры над морам для іх — звычайная забава. Плавае сняжынка ў небе — ды і толькі. Вялікі аматар жывой прыроды матрос Жураўка пелікану на вышыні не знайшоў лепшага параўнання.

Наш карабель стаяў на якары непадалёку ад берага. Каманда адпачывала пасля ранішняй прыборкі ў каютах і кубрыках.

Я падняўся на капітанскі мосцік і назіраў за пеліканам, які кружыў над морам.

Раптам я пачуў стрэл і ўбачыў, як пелікан упаў на ваду. Я агледзеўся на бераг, але нікога не заўважыў.

Пелікан, узмахваючы адным крылом, кружыў па вадзе.

Птушка паранена, яе трэба ратаваць, а шлюпак няма. На іх матросы адправіліся на бераг.

Я хуценька спусціўся на палубу па крутому трапу, разуўся і распрануўся. І з борта нырнуў у цёплую ваду.

Быў тады лёгкі, дужы, плыткі. Узняў руку, каб схапіць пелікана за шыю. А ён дзюбай, як кінжалам, мне ў далонь.

Як жа быць?

Прасіць дапамогу з карабля? Каб пасля матросы смяяліся з боцмана?

Не, сам вазьму пелікана!

Я падплыў да птушкі з другога боку. А пелікан раптам абапёрся на параненае крыло, ажно скігатнуў, мусіць, ад болю. Імгненна да мяне крутануўся. І дзюбай як не ў вока. Рассек брыво!

У вачах у мяне пацямнела, кроў паплыла па твары.

Я ўгнуў галаву. Адступаць перад камандай, якая высыпала на палубу, мне не хацелася. Ды тут на

мяне абрынуліся ўдары па галаве, спіне і нагах. Пелікан біў дзюбай і здаровым крылом.

Я нырнуў, адплыў. Аглянуўся. Пелікан мяне даганяе. Раз'ятрыўся.

Птушка не разумее, што ёй хочуць аказаць дапамогу.

Зноў я даў нырца.

Акрываўлены, падняўся на палубу. Матросы падхапілі мяне пад рукі, павялі да карабельнага ўрача.

Пакуль мне рабілі перавязку, да карабля падаспела шлюпка. Пасля звальнення на бераг смельчакі матросы на вёслах падгрэбліся да параненай і знясіленай ужо птушкі. Падабралі пелікана-разбойніка. Пусцілі на палубу.

Кармілі птушку рыбай. Прыручылі яе.

Перабітае крыло ў пелікана зраслося. Ён ужо зляtaў на ваду, карміўся рыбай.

Аднойчы вечарам пелікан узняўся ў паветра і паляцеў у зялёны чарот заліва. І на карабель не вярнуўся.

## ГЛАФІРА

У Аўстраліі шмат рэдкіх жывёл і раслін. Кенгуру. Райскія птушкі. Рыбы-ліраxвосты. Дрэвы-папараці. Эўкаліптавыя дрэвы.

І сярод гэтага казачнага свету — чаплі...

...Мы пакідалі чужы порт. Павольна выходзіў карабель з бухты. І раптам на беразе пачулася стральба.

У неба ўздымаліся птушкі. Але многія з іх не маглі набраць вышыню — падалі ад трапных стрэлаў.

— Райскіх птушак б'юць,— бедаваў матрос Жураўка, разглядаючы ў бінокль бераг.— От, браканьеры! І ўправы на іх няма.

Высока ў небе ён убачыў чорную кропку. Прыгледзеўся, сказаў з палёгкай:



— Чапля... Уратавалася ад куль...

— Загіне ў акіяне,— пашкадаваў я.— Усюды хапае браканьераў...

— Таварыш боцман! — крыкнуў Жураўка.— Птушка зніжаецца!

Чапля, распластаўшы крылы, як бы даганяла карабель.

У непагадзь аслабелыя птушкі нярэдка знаходзілі ратунак на палубе нашага карабля. Але тое было ў акіяне. А тут чапля ад берага ляціць...

Чапля апусцілася на карму. Ніхто не падыходзіў да яе, баючыся спалохаць госцю.

Жураўка з капітанскага мосціка ў бінокль уважліва разглядаў чаплю. А потым спакойна аб'явіў:

— Таварыш боцман, а Глафіра, здаецца, і не паранена...

Чаму ён так назваў чаплю — і ў галаву не прыходзіла распытаць у яго ні тады, ні пазней. А імя адразу прыжылося.

Ужо далёка ў акіяне Глафіра нечага выцягнула шыю, узмахнула крыламі. Але ў паветра не ўзнялася.

— Развіталася з берагам,— выказаў здагадку Жураўка.

— Знайшла ў нас ратунак ад браканьераў,— удакладніў я.

Глафіра хутка асвоілася на караблі, хоць блізка да сябе матросаў не падпускала. Найбольш каманду непакоіла тое, што яна нічога не ела. І хлеб ёй кідалі, і аўсянку сыпалі, і мяса давалі. Адварочвалася. Падыходзіла да борта, сумна глядзела ў ваду.

Жураўка першы здагадаўся: узяў вуду, налавіў рыбы. Сядзіць на палубе, частуе птушку. А тая і рада — толькі давай! Згаладалася па рыбе.

З таго часу і пайшло: то адзін, то другі матрос рыбачыць. Занятыя справай і па доме не так, як раней, сумуюць.

Карміў жа Глафіру толькі Жураўка. Прывучыў яе да карабельнага распарадку. На сняданак, абед і вячэру чапля не спазнялася.

Прывыклі мы да кругласутачнага дзяжурства Глафіры на палубе. Ні разу не пакідала яна карабель. Але ў адным праліве, які кішэў маторкамі, Глафіра разагналася на палубе і ўзляцела. Узяла курс на зялёны, як луг, астравок на гарызонце. Відаць, спалохалася гулу маторак.

Не паспела яна набраць вышыню, як грымнуў стрэл. Куля, пэўна, трапіла ў самае сэрца, бо чапля каменем упала ў ваду...

## СКАПА

Скапа, ці рыбалоў, як часам яе называюць,— рэдкая птушка-драпежніца. Гняздуецца на дрэвах, каля вадаёмаў і рэк, багатых рыбай.

Было гэта на Дняпры. У самым вусці

яго, каля Херсона, ажно кішэла рыба. На вуду бралася — толькі закідай. Мы налавілі плотак і лінёў, наварылі юшкі. Паабедалі. Мае сябры, пакупаўшыся, палезлі ў палатку. А я загараў і глядзеў на раку. Дакладней, не на раку, а на скапу, якая палявала на рыбу.

Яна пільна выглядала здабычу, кружачыся над Дняпром. Раптам спынілася ў паветры, выпусціла доўгія ногі і куляй кінулася ўніз.



Скапа схапіла кіпцюрамі рыбіну і ўзняла яе, бліскучую і трапяткую, на вышыню. Потым паляцела да ляска. Праз хвілін колькі вярнулася, зноў рыбачыла. І зноў кіравала са здабычай да ляска.

Пакуль скапа адсутнічала, я пачаў назіраць за шчупаком, які паляваў на ластавак. Яны нізка пралятали над вадою, а шчупак тым часам выныраў, але злавіць імклівую птушку яму не ўдавалася.

Нечакана ўгары я пачуў свіст. Не паспеў узняць галавы, як скапа сіганула на шчупака і ўчапілася ў яго кіпцюрамі. Часта махала крыламі, біла імі па вадзе, узнімаючы веера бліскучых пырскаў. Ды не магла ўзляцець.

Я паклікаў сяброў. Дзівімся. І скапа, і шчупак — драпежнікі. Адзін — паветраны, другі — вадзяны. Скапа моцна ўчапілася, не адпускае здабычу. І ўзняць яе не можа. А шчупак, пляснуўшы хвастом, павёў яе за сабою. Усё далей і далей ад берага.

Скапа, распластаўшы крылы, нібы плыве па вадзе. Бачым, ужо схавалася яе цёмна-бурая спіна. А потым і ўся яна патанула, цягнучы за сабою след. Але і гэта працягвалася нядоўга. Ні скапы, ні шчупака.

Розныя здагадкі выказвалі мае сябры.

— Шчупак быў дужа вялікі,— гаварыў старшына Яршоў, і яму ніхто не пярэчыў.

— Скапа ўчапілася мёртвай хваткай,— сціснуўшы пальцы ў кулак, паказаў малады боцман Туманаў.— Не магла адпусціць кіпцюроў.

— Шчупак аглушыў скапу хвастом,— удакладняў Яршоў.— Сама сябе пакарала за сквапнасць.

З ім нельга было не пагадзіцца. Звыклая да лёгкіх перамог скапа без роздуму кінулася на вялізнага шчупака і стала ахвярай.

# БАКЛАНЫ І БАБУРЫ

Гэта нас уразіла і збянтэжыла. На спіне вялікай белай птушкі стаяў чорны баклан з апушчанымі мокрымі крыламі. Мы паклікалі на палубу матроса Жураўку. Ён рассмяяўся:

— Бабура вязе на спіне нырца-баклана!

— Як вязе? — спытаў я.— Для чаго?

— Баклан — лепшы нырэц з марскіх птушак. А бабура — гультаяватая. Ды не можа доўга заставацца пад вадою. Яны сябруюць...

У тое, пра што расказваў Жураўка, мы мала паверылі. Навошта ж тады ў бабуры пад дзюбай скураны мяшок, куды яна хавае рыбу?

Ды тут якраз і пачалося відовішча. Баклан уз-



махнуў крыламі, узляцеў над вадою і нырнуў на глыбіню. Хвілін колькі не паказваўся на воднай гладзі. Нарэшце вынырнуў, бліснуўшы трапяткой рыбкай у дзюбе, падплыў да бабуры. А тая спрытна выхапіла ў рыбака здабычу. Так паўтаралася некалькі разоў. Нарэшце, баклан ускочыў на спіну бабуры, звесіў мокрыя крылы.

Я пашкадаваў бабураў. Маюць яны мяшкі, а лавіць рыбу не ўмеюць!

Жураўка папрасіў набрацца цярпення. І хутка паказаў паляванне бабураў на рыбу. Сабралася іх чарада на мелкаводдзі ў заліве. Адсеклі ад мора касяк. Пачалі пляскаць крыламі па вадзе, узнялі скігатанне. Прыгналі рыбак да берага і давай напаўняць ёю мяшкі пад дзюбай. А яны ж расцягваюцца, як гумавыя...

Бабуры кормяцца рознай дробяззю. А вось бакланы, ныраючы на глыбіню, вылоўліваюць каштоўную рыбу, адганяюць ад берагоў касякі.

Дзіўнае відовішча і вялікую загадку ўяўляюць сабою бакланы на спінах бабураў!

## КАЙРЫ

На астравах Ледавітага акіяна шмат што ўражвае. Але сапраўдным цудам Поўначы можна назваць кайраў.

З выгляду яны нагадваюць пінгвінаў. Толькі значна меншыя за іх. Ходзяць жа — як людзі. Замест рук у птушак маленькія крылы.

Спачатку мы разглядалі кайраў здалёк, у бінокль, каб не напалохаць.

Захапляла апярэнне птушак. Галава, шыя і спіна ў кайраў чорныя. А брушка белае. Уражанне такое, што апрануты яны ў чорныя з капюшонам курткі, расшпіленыя ад спякоты. Вакол вачэй — белыя кругі, нібы акуляры.



Наш карабель павольна наблізіўся да вострава. Мы з матросам Жураўкам апусцілі на ваду шлюпку, падплылі да берага. Яшчэ больш здзівіліся: кайры, як прывязаныя да скал, не ўцякалі ад нас, сядзелі ярусамі на выступах.

Жураўку вельмі захацелася забрацца хоць бы да аднаго гнязда. Зрабіць гэта было няпроста. Скалістыя схілы на востраве аказаліся крутымі і коўзкімі. І ўсё ж мы ўзабраліся на скалу.

Кайры аглушальна крычалі, рэдка каторая ўзлятала са свайго месца. І зноў садзілася непадалёку ў цесны ярус.

Мы заўважылі, што ў лапках кайры пераносяць яйкі. Не ўсе ўтрымліваюць іх у палёце, некаторыя яйкі падаюць і разбіваюцца аб скалы.

Спачатку падумалі, што кайры такім чынам выказваюць нам свой пратэст: не лезьце да нас, не чапайце нас, а то знішчым усе яйкі. Ды хутка высветлілася, што гэта не так.

Жураўка дакрануўся да адной з птушак, асцярожна ўзяў яе ў рукі. Яна моцна трымала ў лапках яйка. Ніякага гнязда пад ёй не было. Матрос перадаў

кайру мне, а сам узяў другую. Яна крыкнула і выпусціла яйка, якое разбілася аб скалу. Жураўка ўздыхнуў і адпусціў птушку. А маю кайру — з яйкам у лапках — пасадзіў на месца.

Пастаяўшы, мы заўважылі, што кайры не толькі гучна і злосна крычаць, але і б'юцца дзюбамі. І ўсё з-за той птушкі, якая разбіла яйка. Страціўшы сваё, яна спрабавала забраць чужое яйка.

Мы селі ў шлюпку і вярнуліся на карабель. Параілі камандзіру не адпускаць матросаў на востраў. Ён так і зрабіў.

Адпачыўшы, каманда зноў стала на вахту. Паход працягваўся. Шмат бачылі астравоў з птушкамі, але кайраў на іх было значна менш, чым на першым, што трапіўся нам у акіяне.

## ЖУРАЎЛІ І ЖУРАЎКА

Тры дні і тры ночы з берага дзьмуў халодны норд — паўночны вецер. Шторм быў — не ўтрымацца на палубе. Хвалі імкліва набягалі на борт карабля, гайдалі аграмадзіну, як трэску. А пырскі ад хваль узляталі ажно на камандзірскі мосцік.

Неба зліваласся з успененай вадою. А шэрань і вецер наганялі сум і трывогу.

Як чакалі мы сонца, хоць бы праменьчыка светлага з-за хмар!

Стомлены і засмучоны матрос Жураўка неаднойчы пытаўся ў мяне:

— Чаго мы тут, боцман, стаім сярод мора?

— Чакаем з берага пагоды,— адказваў я, бо і сам не ведаў, якую задачу вырашаў наш карабель.

На чацвёртыя суткі стыхія ўнялася. Аціх вецер. Супакоілася мора. І выглянула з-за парадзелых хмар лагоднае сонца.

Вольныя ад вахты матросы вудзілі рыбу на карме карабля.

Жураўка ў бінокль разглядаў аднастайнае навакολле.

І раптам ён ажывіўся:

— Хлопцы, глядзіце! Да нас на карабель апускаюцца жураўлі!

Кок Бузук, які чысціў свежую рыбу на палубе, сказаў лагодна:

— Цябе, пэўна, хочуць забраць у вырай...

Усе са здзіўленнем глядзелі, як на бак — пярэднюю частку карабля — апускаюцца жураўлі. Выцяг-



ваюць доўгія ногі, прабягаюць колькі крокаў, апускаюць крылы.

Яны не звярталі асаблівай увагі на матросаў. І што прывяло іх на наш карабель?

Не ведалі мы, чым харчуюцца жураўлі. Нават Жураўка нейкі час стаяў у задуменні. Хіба ж мог ён уявіць, што давядзецца не толькі ўбачыць зблізку такую рэдкую птушку, як журавель, але і карміць яе.

Адно ва ўсіх на языку: жураўлі не ядуць рыбу. А тут Жураўка ўзяў селядца з вядра — самага маленькага і жвавенькага. І падкінуў птушкам. Яго адразу падхапіў самы вялікі, з чорнымі пярынкамі на крылах журавель. Няцяжка было здагадацца, што гэта быў важак.

Матросы ажывіліся. Бралі ў кока жывую рыбу і кідалі птушкам. Жураўлі яе падбіралі.

Матрос Жураўка здымаў незвычайных гасцей сваім фотаапаратам, бегаючы з месца на месца па капітанскім мосціку.

Ляцелі птушкі ў цёплыя краіны.

Узрушаныя, мы моўчкі махалі на развітанне сваім гасцям. Няўжо іх напалохалі браканьеры? Ці скавала марозам дзе ўзбярэжжа, пазбавіўшы жураўлёў традыцыйнага корму? Мог і прыліў затапіць стаянку дзікіх птушак...

І сёння для мяне з'яўляецца загадкай: чаму жураўлі селі на палубу нашага карабля?

## ЛАСТАЎКІ

Жыў я тады на каўказскім узбярэжжы Чорнага мора. На першым паверсе цаглянага дома.

Цяплынь там амаль круглы год. Дык дзверы ў пад'езд зачыняліся толькі ў вялікі шторм, калі з мора дзьмуў шалёны вецер.

Аднойчы пайшлі мы на вучэнні ў мора. Помню, добра адстраляліся. Аб'явілі нам падзяку. Шчаслівыя, вярнуліся цёплым вясновым днём на базу.



Іду я дамоў. Толькі ступіў у пад'езд, як дзве ластаўкі ў мяне над галавою вылецелі на вуліцу. Прыгледзеўся: лепяць гняздо пад лесвіцай у куточку. Што ж — няхай водзяцца. Птушкі давяраюцца добрым людзям.

Суседзі таксама не сталі разбураць гнязда. Каму ж не хочацца быць добрым чалавекам?

Не разумеў нас толькі шэры кот Васька. Пачаў цікаваць за ластаўкамі. Я колькі разоў праганяў яго з пад'езда. Нарэшце адступіўся: кот стары, не зловіць вёрткіх ластавак.

Знесці Ваську ў горы я не мог. Вельмі многа праплаваў ён з намі на караблі, шмат перанёс гайданак і штормаў. Мышамі ў нашых каютах, адсеках і трумах нават не пахла.

Але ж тут іншая сітуацыя!

І бяда здарылася. Васька ўсё ж падпільнаваў ластаўку. Ніхто, можа, і ўвагі не звярнуў бы, калі б не крык другой ластаўкі. К вечару яна ажно ахрыпла. І голас яе здаўся стогнам, ад якога рабілася не па сабе.

Гняздо ў пад'ездзе нейкі час пуставала. Зямліста-шэрае, узорыстае. Калі ні ідзеш, дык узнімеш галаву, каб на яго паглядзець.

Нарэшце ў двары зноў закружыліся дзве ластаўкі. Адна з іх то залятала ў пад'езд, то вылятала на двор, нібы запрашала новую сяброўку ў сваю хатку-гняздо.

Новенькая доўга сядзела на дроце, аглядалася, быццам не ведала, што ёй рабіць. Усё ж адважыла-

ся, шмыгнула ў пад'езд, села ў гняздо. І раптам пачала выкідаць яйкі.

Наша ластаўка крыху пачакала, здзіўленая, а затым напала на разбойніцу. Ледзь уцякла тая з пад'езда.

А наша ластаўка села на яйкі, якія не паспела разбіць залётная ластаўка. І вывела двое птушанят.

## ГАГАРКІ

Аднойчы мы сталі на якар у Ціхім акіяне. Як бы пасярод яго, бо навокал былі вада і асветлены сонцам купал блакітнага неба.

Ніхто з нас не заўважыў, калі і ад-



куль каля карабля з'явілася чародка маленькіх белых птушачак з чорнымі спінкамі і крыльцамі. Яны плавалі і ныралі, як бы забаўляліся самі і нас забаўлялі. Птушачкі ўзмахвалі крыльцамі, нагадваючы пінгвінаў.

Знаўца акіянскай стыхіі Жураўка спытаў у мяне:

— Дык што гэта за птаства, боцман? Ты столькі плаваў...

Але ж я такіх птушачак бачыў упершыню. Імгненна яны зніклі.

Матрос Жураўка пабег у кубрык. Там у яго былі розныя даведнікі.

Праз колькі хвілін ён аб'явіў па карабельнай сувязі:

— Таварыш боцман, да нас падляталі гагаркі. Водзяцца яны ў Арктыцы... Нейкая нядоля сагнала гагарак у Ціхі акіян...

Мы доўга стаялі на палубе і сузіралі наваколле.

## ХМАРКА НАД АКІЯНАМ

Мінулі Гібралтарскі праліў, выйшлі ў Атлантычны акіян. Паўз высокі бераг Афрыкі ўзялі курс на экватар.

На палубе — шукальнік прыгод матрос Жураўка. У бінокль разглядае гарыстае Марока. Горы як горы. Вышыннымі снежнымі пікамі падпіраюць блакіт неба. Ніжэй і бліжэй да нас — зялёная раўніна са шматлікімі селішчамі.

Матрос Жураўка ўздымае бінокль у неба. Яно чыстае, белае, як распаленае ў якім горане. І ні хмурынкі!

Але чаго засяродзіўся, нібы ў адну кропку, матрос Жураўка? Не паварочваецца, не адымае бінокль ад вачэй. Хвалюецца, тупае на месцы, пацепвае плечукамі.

Доўга глядзіць Жураўка. Потым апускае бінокль, падыходзіць да мяне, прапануе паглядзець у неба.



Падае свой бінокль мне. Ведаю, што не проста непакоіцца матрос. Нешта прыкмеціў у чыстым небе. Тым больш што мне пачуўся далёкі гул.

Глянуў я праз шкельцы бінокля і адразу ж устрывожыўся.

— Што там такое? — спытаў матрос Жураўка, пэўна, заўважыўшы мой неспакой.— Што, боцман?

— Хмарка над акіянам,— адказаў я спакойна і паспяшаўся да капітана.

Хмарка павольна разрасталася ў вялікую цёмную хмару.

Капітан быў на масціку. Глянуў ён у бінокль і адно глыбока ўздыхнуў. Набліжалася небяспека.

Пра саранчу мы з ім трохі ведалі. У Афрыцы яна асаблівая. Збіраюцца мільярды насякомых. Хмара вырастае да трох і больш тон. На сваім шляху саранча з'ядае ўсё, што трапляецца. За мінуту можа ачысціць да бляску фарбу з надводнай часткі любога карабля. Дастаецца і людзям.

А між тым хмара расла, гул рабіўся ўсё больш пагрозлівы. Жураўка азірнуўся на капітанскі масцік, даў паглядзець у бінокль вольным ад вахты матросам.

— Што будзем рабіць? — занепакоена спытаў я.— Фарбы ў запасе мала, толькі для дробнага рамонту. Салёная вада раз'есць агалены корпус...

— Спакойна, боцман,— усміхнуўся капітан ка-

рабля.— Уключым помпы. Саранча баіцца салёнай вады... Ды і ляціць яна высока...

Ён аб'явіў трывогу, але не сыходзіў з мосціка, назіраў за хмарай, якая ўсё набліжалася, цямнела. Вось яна засланіла сонца, і тое праглядалася, як праз задымленае шкельца. Але нядоўга працягвалася «зацьменне». Сонечны дыск зіхацеў, асвятляў промнямі карабель і марскую роўнядзь.

Хмарка пачала змяншацца, матрос Жураўка ўзняў бінокль.

З берага данесліся стрэлы гармат. Мараканцы адбіваліся ад навалы.

Калі сталі на якар, капітан сабраў на палубе каманду і аб'явіў матросу Жураўку падзяку за пільнасць на службе.

## КУРАНЯТКА

Некалькі тыдняў мы затрымаліся на экватары. Гарачыня стаяла, як у лазні. Палуба вельмі праграваласся зыркім паўднёвым сонцам, што рукой не дакрануцца. Дык яе час ад часу палівалі вадою з-за борта.

Карабель стаяў на рэйдзе каля белакаменнага партовага горада. Матросы любілі на шлюпках хадзіць на бераг, часта бывалі ў звальненні.

Крыху здзівіла мяне, што аднойчы матрос Жураўка адмовіўся ад прагулкі ў горад. Ён таптаўся каля сігнальшчыка. Гаварыў з ім і нечага прыслухоўваўся. Але ж наўкола цішыня. Толькі хвалі плёскаюцца за бортам.

І раптам — ціўканне! Танюсенькае, пранізлівае: ціў, ціў, ціў!

Жураўка глядзіць на нас. Мыляе вуснамі, як бы хоча рассмяяцца.

— Што такое? — крычыць яму камандзір з капітанскага мосціка. І не дачакаўшыся адказу, пытаец-



ца ў мяне: — Птушкі звілі гняздо на караблі, вывелі птушанят?

Я разгубіўся, адказваю:

— Не можа такога быць, таварыш камандзір! Учора была генеральная прыборка. Усё прагледзелі і пачысцілі...

Жураўка папрасіў сігнальшчыка адчыніць скрынку з запаснымі флажкамі. Дастаў адтуль жоўценькую, як дзьмухавец, жывую істоту, пасадзіў яе на далонь.

— Нейкае куранятка,— вымавіў я без асаблівага захаплення, бо не ведаў, што скажа камандзір.

Але ён рассмяяўся:

— На караблі папаўненне! Трэба ставіць птушанё на забеспячэнне, таварыш боцман...

Жураўка пачуў яго словы і адказаў:

— Гэта ж куранятка, таварыш камандзір! Вывелася з курынага яйка!

— А дзе ж квактуха? — спытаў я.— Хто дазволіў выводзіць куранят?

Жураўка крыху разгубіўся, не ведаў, што адказаць.

Супакоіў нас камандзір. Ён лагодна ўсміхнуўся і расказаў выпадак, які адбыўся на экватары ў час пераходу эскадры караблёў з Балтыкі на Далёкі Ус-

ход. Было гэта ў пачатку дваццатага стагоддзя. Пісьменнік Новікаў-Прыбой удзельнічаў у тым паходзе і апісаў яго ў кнізе «Цусіма». Ён расказаў пра куранятка, якое вывелася без квактухі.

Жураўка падышоў да нас і пацвердзіў, што паўтарыў колішні эксперымент.

## МАКАКА

У Афрыцы водзяцца смешныя на выгляд, вясёлыя маленькія малпачкі макакі. Сыдзеш, бывала, на бераг, а яны — і на дрэвах, і на дахах дамоў, і на балконах, і ў людзей на руках. Ажно мітусіцца ўсё ў вачах. Макакі — бяскрыўдныя, зграбныя істоты.

Не помню ўжо, у якім афрыканскім порце рыжаватую макаку купіў матрос Жураўка. Прынёс яе ў сумцы. Выпусціў на палубу. А карабельная сталь гарачая ад зыркага на экватары сонца. Дык малпачка саскочыла на трап і прабралася па ім ажно на капітанскі мосцік.

Аднойчы ў маёй каюце гулялі ў даміно. Ад гарачыні былі насцеж расчынены ілюмінатары і люкі. Круглыя суткі яны не задрайваліся.

Макака і заглянула да нас. Спачатку скокнула на банку, як на флоце называюць звычайную табурэтку. Затым залезла на плячо, лізнула вуха, шчаку.

Неўпрыкмет яна саскочыла на стол, заглянула мне і Бузуку ў вочы. Вадзіла па кляёнцы доўгім хвастом, цокала рэдкімі зубкамі. А толькі мы пачалі чарговы раз тасаваць касцяшкі, як у гэтую работу ўключылася і яна. Ды з такім захапленнем, што добрая палавіна касцяшак зляцела са стала. Бузук падняў іх з долу. Паківаў пальцам. Малпачка, як бы зразумела яго пагрозу, саскочыла на банку, прыціхла.

У паходзе ўсе прывыклі да памаўзлівай макакі. І кармілі яе, і на руках гушкалі. Жураўка браў яе з сабою ў душ. Малпачка не любіла духаты.

Найбольш часу, калі ў мяне выдавалася вольная хвіліна, малпачка праводзіла ў маёй каюце. Асабліва падабалася ёй наша гульня ў даміно. З ахвотай яна ўсякі раз тасавала касцяшкі.

Аднойчы малпачка выскачыла з каюты. Узабралася на капітанскі мосцік. Нядоўга там забавілася. Апусцілася на палубу. Памітусілася паміж карабельных надбудоў. Злазіла на ствол гарматы. Паспрабавала грызці брызент на блоках радыёлакацыйнай станцыі. Паўз дзяжурнага матроса шмыганула на пірс. Сіганула на дрэва. Скочыла адтуль на дах трохпавярховага дома.

За макакай на пірс высыпалі матросы на чале з Жураўкам. А малпачка — на таполю. Забралася на верхавіну. Гушканулася на галіне і пераскочыла на другое дрэва.

Сабраўся натоўп. Узняўся шум і гам.

Жураўка амаль плакаў. Пытаўся ў Бузука, як прыступіцца да макакі.

Бегаў і я за той малпачкай, як малое дзіця. І раптам падумаў: а што, калі касцяшкі даміно рассыпаць па тратуары? І паклікаць пакрыўджаную, каб сабірала.

Так мы і зрабілі. Натоўп расступіўся. Кок Бузук рассыпаў касцяшкі. Макака асцярожна спусцілася на асфальт. Пакружылася на чацвярэньках каля касцяшак, пачала збіраць у каробачку, якую побач паставіў Бузук.

Яна і не заўважыла, як падкраўся матрос Жураўка і падхапіў малпачку на рукі.

Доўга жыла макака на нашым караблі.

## РЫЖАЯ ХІТРУГА

Ліса — драпежнік, належыць да сямейства сабачых. У нашай краіне сустракаецца паўсюдна. Няма яе толькі на Крайняй Поўначы. І цяжка сказаць, дзе яны лепш сябе пачуваюць — на поўдні

ці поўначы, у стэпе ці ў гарах, ва ўкраінскай дубраве ці беларускім балоце. Ліса — блізкая радня ваўку, сабаку і шакалу. Але многім ад іх адрозніваецца. У яе падушачкі лап пакрыты поўсцю. Вочы, як у кошкі. У павадках лісаў яшчэ адна каціная якасць: яны ніколі не жывуць чародамі і палююць у адзіночку.

Лісе як гераіні многіх дзіцячых казак можа пазайздросціць любы звер. Яе імя ўвекавечана ў мностве прымавак і пагаворак: адна ліса семярых ваўкоў ашукае; хто ліслівы, той куслівы; у вочы лісам, а за вочы воўкам; у лісы хвост доўгі, а на свой не сядзе...

Называюць лісу Патрыкееўнай. Чаму? Адкуль узялася такая мянушка?

Аказваецца, ад Патрыкея Нарымунтавіча — князя з Ноўгарада, які жыў каля сямі стагоддзяў таму назад. Ён так праславіўся сваёй вынаходлівасцю і хітрасцю, што яшчэ пры яго жыцці імя Патрыкей стала раўназначным слову «хітруга». А ліса ж здаўна лічылася хітрым зверам, дык і атрымала мянушку — Патрыкееўна.

Аднойчы з гары каля Анапы на ўзбярэжжы Чорнага мора мне давялося асабіста назіраць лісінае хітраванне. Было гэта зімой. Некалькі дзён кружыла мяцеліца. Замяла ўсе мышыныя норкі.

Ліса спяшалася. Прыпыніцца, павядзе носам пах наваколля. Няма спажывы. Бяжыць далей. Стане на заднія лапы, прыслухаецца, ці не пісне дзе мыш. Усё прыкрыта снегам. Дык бярэ кірунак да гарадской звалкі, над якою кружацца вароны.

Раптам запаволіла крок і... расцягнулася на снезе...

Прысеў я на пянёк і назіраю: што ж будзе? Няўжо якая дурная варона палічыць яе нежывою?

Паклаў я ружжо на калені, назіраю. Ліса ляжыць нерухома. Вароны кружаць і кружаць над ёю, садзяцца на снег усё бліжэй і бліжэй да Патрыкееўны. Адна ўжо села, каб дзеўбануць у галаву. А ліса імгненна страпянулася і схапіла яе вострымі зубамі

за крыло. Пачаўся паядынак. Над лісою ўзняўся воблачкам сыпучы снег.

Праз колькі хвілін ад вароны пачало разлятацца ў бакі чорнае пер'е. Пад крык варон і сарок ліса спакойна спажывала здабычу.

## ПТУШЫНЫ РОХ

Хтосьці з матросаў у паходзе ўспомніў пра казачную птушку рох. Дык я сказаў, што мы будзем праходзіць каля вострава, на якім некалі гэтыя веліканы вадзіліся.

Чаму веліканы? Яйка роха замяняе паўтары сотні курыных яек!

Кок Бузук адразу задумаўся. Разважліва прыкінуў, што адным яйкам ён мог бы накарміць усіх камендораў, як на флоце называюць звычайных артылерыстаў.

Матрос Жураўка пацікавіўся, ці будзем мы спыняцца каля таго вострава без назвы. На нашай жа карце назвы яго не было. Стаяла кропка.

Жураўка стараўся ўявіць, намаляваць нам узмахамі рук птушку-велікана, падобную на арла. З невялічкімі крыламі, нібы ў страуса. Крыламі без доўгіх махавых пярынак, як у звычайных птушак.

Каля таго вострава, на якім даўней вадзіліся веліканы рох, мы не прыпыняліся. У кожным паходзе каманда карабля вырашае пэўную стратэгічную задачу. Не ўбачылі мы і казачнай птушкі на беразе, на што так спадзяваўся Жураўка.

Адно ў бінокль добра разгледзелі вялікае яйка, якое людзі склеілі з тысяч шкарлупінак. Побач з ім на пастаменце, як макавае зерне каля вялікага гарбуза, ляжала курынае яйка.

Яйка-гара было своеасаблівым помнікам птушцы рох.

Застаўся далёка за караблём, знік на гарызонце востраў без назвы. А мы, вольныя ад вахты матросы

і боцман, былі ў задуменні. На пятай, можа, мілі цяжка ўздыхнуў матрос Жураўка і сказаў:

— Эх, людзі... Калі б птушак рох не вынішчылі... Ды вадзіліся ў морах і акіянах каровы...

Думка яго была ўсім зразумелая: мы, зямляне, жылі б значна лепш, чым жывём.

## АГНІСТЫЯ ГУСІ

Ноччу наш карабель стаў на якар у заліве невялікага астраўка ў Індыйскім акіяне. З нізкай вадзяністай хмарнасці сыпаўся дробны дождж. Абуджаныя гулам матораў, з гіканнем кружыліся ў паветры птушкі. Матрос Жураўка, стоячы каля люка ў свой кубрык, сказаў:

— Сабралася птаства на зімоўку...

І апусціўся ў кубрык.

Ачнуўшыся раніцай, я паспяшаўся на палубу. Матрос Жураўка тупаў каля гарматы і ў бінокль аглядаў заліў і востраў. Праз колькі хвілін усклікнуў:

— Якія агністыя гусі!

Ён аглянуўся і заўважыў мяне. Прапанаваў бінокль:

— Паглядзі, боцман! Агністыя гусі!

Я ўзяў бінокль і задыхнуўся ад прыгажосці. Казачна-ружовыя птушкі тоўпіліся на мелкаводдзі і на беразе невядомага вострава. Раз-пораз яны ўзмахвалі чырвонымі крыламі. Здавалася, што танцавалі. Вада і бераг пераліваліся пунсовым ззяннем. У птушак былі доўгія ружовыя шыі і тоўстыя, гарбатыя дзюбы. Ногі — кармінавыя, нібы парэпаныя ствалы чарналесся.

Захопленыя відовішчам, мы не заўважылі, як да нас падышоў камандзір. Глянуў у бінокль і кажа:

— Ды гэта ж фламінгі... Ну, па-нашаму, палымяныя гусі...



— Агністыя,— папраравіў яго Жураўка.
— Называй агністымі,— сказаў камандзір.— Што кіем, што палкаю...
А птушкі, нібы пачуўшы нашу гаворку, узляцелі. Неўзабаве ружовае воблака схавалася за гарызонтам.
Вахценны афіцэр з камандзірскай рубкі аб'явіў сняданак. Нехаця пакідалі мы палубу.

# ГАЛОДНЫЯ АРЛЫ

Гэтую праяву я назіраў у Каўказскіх гарах на ўзбярэжжы Чорнага мора...

Была раніца ціхага летняга дня. З карабля добра праглядалася вяршыня, на якой збудавалі сваё гняздо арлы. Сонечныя промні нібы залацілі арліцу, пад распушчанымі крыламі якой скігаталі, просячы корму, маладыя арляняты.

Нерухома сядзеў на скале непадалёку ад гнязда арол-бацька. Ён углядаўся на белаватую палоску, якая расла на ўсходзе ўздоўж далёкага марскога гарызонта.

Птушак стамляў голад. Стоенае мора корму не давала. Далёкія палёты над сушай прыносілі жабрацкую здабычу. Ні рыбы ў вадзе, ні дзічыны на беразе!

Арліца-маці выглядала задумлівай і спакутаванай. Яе чубок быў растрапаны, яршысты. Вочы — агністыя і поўныя трывогі, хвілінамі бляклі, нібы мярцвелі.

Учора, кружачыся ў небе, яна выгледзела вялікую рыбіну. Скіравала з вышыні і ўпілася кіпцюрамі ў паласатую спіну. Ды рыбіна аказалася вельмі моцнай, яна пагружала арліцу ўсё глыбей і глыбей у ваду. І птушка ледзь не захлынулася, пакуль ёй удалося адпусціць свае кіпцюры.

Як толькі сонца ўзнялося над гарызонтам, арол-бацька выцягнуў шыю, узняў крылы і ўскрыкнуў. Зноў супакоіўся. Нейкі момант ён сядзеў нерухома. Разглядаў мора, гняздо з арліцай і птушанятамі. Раптам, склаўшы крылы, арол сігануў уніз, як бы за якой здабычай. І знік пад вадой. Магчыма, ён учапіўся кіпцюрамі ў якую вялікую рыбіну і пайшоў за ёю на дно.

Арліца ўзнялася ў паветра, павольна махаючы крыламі, пакружыла над морам. І таксама каменем упала ў ваду. Пабыла нейкі час на глыбіні і, нежывая ўжо, усплыла далекавата ад берага.

У бінокль я разглядаў арлянят. Яны мітусіліся ў гняздзе, скігаталі, аглядалі мора. Ім вельмі хацелася есці.

І вось птушаняты адно за адным, узмахнуўшы сваімі слабымі крыльцамі, пакаціліся ўніз па абрывістым схіле. Плюхнуліся ў мора. Але не патанулі. Гайдаліся на хвалях...

Я збіраўся апусціць на ваду шлюпку і забраць на борт згаладалых птушанят-арлянят. Але камандзір даў каманду знімацца з якара.

Наш карабель узяў курс на Севастопаль...

## БЫЧЫНЫ РОГ

Неяк матрос Жураўка прынёс на карабель незвычайную птушку з вялікай яркай дзюбай і масіўным нарастам над ёю. Кок Бузук, калі згледзеў яе, гучна крыкнуў:

— Глядзіце, бычыны рог!

Было гэта, ужо нават не помню дзе. Ці ў трапічнай Афрыцы. Ці на Аравійскім паўвостраве. Ці ў Паўднёвай Азіі. А можа, і на адным з астравоў у Ціхім ці Індыйскім акіянах. Там падобных на бычыны рог птушак называюць насарогамі.

Але нас у той момант найбольш цікавіла не дзюба птушкі, а тое, чым яна корміцца.

У клетцы, якую заўсёды меў на караблі матрос Жураўка, парушаючы мой строгі боцманскі загад, птушка бычыны рог паводзіла сябе спакойна. Магчыма, ранейшым сваім гаспадаром была прывучана да жыцця ў няволі.

Жураўка налавіў невялічкіх рыбак і, каб не адкрываць клетку, паставіў бляшанку збоку. Іншыя птушкі з ахвотай цягалі сабе корм праз шчыліны. А бычыны рог не мог, бо яму замінаў вялікі нараст над дзюбай, пра які забыўся Жураўка.

Ён кінуў некалькі рыбінак праз дзірку ў накрыўцы. Бычыны рог адразу іх праглынуў.

Кок Бузук прынёс і насыпаў птушцы пярловых і рысавых круп. Рысавыя яна старанна падабрала, а пярлоўку пакінула.

Нечакана з астаткаў ежы птушка пачала ляпіць гняздо. Тады з нас ніхто не ведаў, што адна яна не магла зрабіць яго. Потым мы даведаліся: самка бычынага рога звычайна сядзіць у гняздзе і замуроўвае сябе тым матэрыялам, які прыносіць самец. У гняздзе застаецца невялічкая адтуліна, праз якую ён корміць наседку.

Самка ў гняздзе, выводзячы птушанят, змяняе свой убор і абрастае яшчэ больш прыгожым апярэннем.

У клетцы самка бычынага рога не выліняла. Чамусьці яна разбіла свае яйкі. А на падыходзе карабля да Адэсы занядужала і прапала.

Птушкі бычыны рог, аказалася, жывуць парамі. У нас была самка.

Тады мы добра разгледзелі дзюбу, нараст на ёй. Ён быў лёгкі і тонкі, як паперовы. Для чаго прырода надзяліла птушку такім рогам — засталося тайнай.

Зусім нядаўна я даведаўся, што самка бычынага рога сядзіць у няволі ад пятнаццаці да дваццаці тыдняў. За дзень шэсць-сем разоў падлятае да яе самец. Корміць нявольніцу. Прыносіць сваёй абранніцы крабаў, лягушак, лятучых мышэй, вужакаў... Ну, і фрукты, адыходы ад іх.

Насатая птушка бычыны рог занесена ў Міжнародную Чырвоную кнігу.

# БЕЛЫ ДАДО

Спакойна вадзіліся белыя галубы дадо на зялёным востраве ў Ціхім акіяне. Марскія вандроўнікі неаднойчы апісвалі іх. Тоўстыя, тлустыя, вагою да паўтара пуда. Гарбатай дзюбай яны нагадвалі арлоў.

На востраве хапала корму. Ніхто галубоў не трывожыў. Дадо тлусцелі, не маглі ўзлятаць на дрэвы. Сталі зямнымі.

Людзі іх, здаецца, не чапалі. Не стралялі, не забівалі палкамі. Не салілі і не прадавалі. Мяса дадо было цвёрдае, як у старой худой качкі.

Але людзі ўсё ж знішчылі і белага голуба дадо. На востраў аднойчы яны прывезлі свіней. Рохлі ла-



вілі і разрывалі на часткі спакойных птушак, разбуралі іх гнёзды. Звялі дадо.

Праўда, жыхары вострава помняць пра белых галубоў. Робяць іх з саломы, плятуць з галінак дрэў. Адзін майстар-аматар зрабіў дадо з жалезных пярын. Пафарбаваў. І прадаў матросу Жураўку.

Голуб быў, я вам скажу, як жывы. Сядзеў на палубе — нібы выводзіў дадуанят.

Жураўка не развітваўся з ім да канца службы. І павёз жалезнага дадо да сябе на радзіму.

## КУРАЧКІ-СУЛТАНКІ

Не дзень і не два прыглядаўся я да гэтых птушак. І ледзь знайшоў адрозненне султанак ад звычайных курэй. У курачак няма грабянёў і бліноў пад дзюбамі. Кароценькія хвасты. Даўгаватыя, як у



бусла, ногі. Надзвычай яркае апярэнне з блакітных і ружовых, з аксамітнымі пералівамі пярынак.

Днём, баючыся людзей і самога святла, курачкі хаваюцца ва ўкрыцці, надзейна маскіруюцца. Вечарам жа ахвотна вылятаюць на галасы сваіх сародзічак. Паляўнічыя карыстаюцца гэтым. У клетках трымаюць палонніц. Вечарамі выстаўляюць househпасткі ў глухіх зарасніках. І султанкі ў іх трапляюць.

Не раз мне даводзілася назіраць, што султанкі пры хадзьбе ківаюць галовамі, як бы дражняць, перакрыўляюць матросаў. Кароценькія хваставыя пярынкі пры гэтым патрэскваюць...

Ды самае дзіўнае тое, што курачкі-султанкі падносяць харч да дзюбы лапамі, як ні адна іншая птушка.

Матрос Жураўка марыў набыць сабе такую прыгажуню, каб навучыць яе карыстацца лыжкай. Ды ў краінах Паўднёвай Азіі забараняецца гандляваць курачкамі-султанкамі, не дазваляецца адтуль іх вывозіць.

## ДРЭВА БЕЗ КАРАНЁЎ

На экватары мы толькі справілі свята Нептуна. Пачалі пераапранацца ў рабочае адзенне. А тут назіральнік-матрос Жураўка падаў трывожную вестку:

— Справа па борце, дзесяць кабельтаў, тарпеда!..

У мяне як абарвалася што ў грудзях. У мірны час! Нідзе нікога не было на гарызонце. Ні радыёметрысты, ні гідраакустыкі нічога не дакладвалі...

Камандзір аб'явіў баявую гатоўнасць. Матросы разбегліся па сваіх баявых пастах.

Мінула колькі трывожных мінут...

Раптам камандзір адмяняе баявую гатоўнасць. Але кладзе руль направа, у кірунку таямнічага аб'екта.

Падыходзім блізка. Плавае на вадзе волатнае дрэва з паўметра ў дыяметры і метраў сто даўжынёю.

— Што такое? — пытаецца здзіўлены матрос Жураўка.

— Водарасць! — смяецца камандзір карабля.— Саргасавым дрэвам называецца...

— Прыплыло сюды? — удакладняе Жураўка.— Чаму саргасава?

— У Саргасавым моры ўпершыню яго заўважылі,— адказвае камандзір.— Тры стагоддзі спрачаліся вучоныя, што гэта такое... Некаторыя сцвярджалі: гэтая трава расце на падводных скалах...

— Магчыма, яна там і расце,— разважае Жураўка.— Адкуль хто ведае?

— Глядзі, карані ёсць?

— Здаецца, няма,— адказвае матрос Жураўка.

— Многа яшчэ загадак у прыродзе,— кажа камандзір.— Хоць на глыбіні ніякая трава не расце...

— А як жа яно магло вырасці на паверхні вады? — разводзіць рукамі матрос.— Ды без каранёў...

— Гэта загадка, таварыш Жураўка,— разважае камандзір.— Хаця дрэва ад паверхні зямлі расце ўверх і ўніз. Значыцца, і тут... Ды гэта водарасць...

Але загадкі той ніхто не разгадаў.

## КАЧКАНОС

Наш карабель стаяў на якары каля зялёнага вострава ў Індыйскім акіяне. Папоўнілі мы запасы харчу, набралі ў бакі пітной вады. Вымылі швабрамі палубы, падфарбавалі барты ў караблі. Матросаў адпусцілі на бераг, у гарадок. Трапіў у звальненне і матрос Жураўка. Ён заўсёды цікавіўся жывёльным і раслінным светам экзатычных астравоў. Іншы раз прыносіў з берага звярка ці птушку, нярэдка весяліў каманду.

На гэты раз матрос Жураўка нас проста ашала-



міў. Прынёс такую жывёліну, што мы проста ахнулі. Нейкае чучала гарохавае, а не жывёліна!

Удаўжкі тое пудзіла было з паўметра. Поўсць на ім густая-густая. Галава заканчваецца дзюбай, як у качак. Лапы перапоначныя. Хвост плоскі, шырокі. На кожнай назе шпора. Жураўка просіць нас не дакранацца да іх, бо сам ужо апёк руку. Шпоры выдзяляюць яд. Ім, мусіць, жывёліна адбіваецца ад ворагаў.

На палубе матросы абступілі жывёліну, дапытваюцца, што гэта такое: не птушка, не рыба, не парнакапытнае. Як жа яна называецца?

Нехта з жартаўнікоў сказаў, што такое пудзіла скроіў і сшыў нейкі хірург-жартаўнік.

Агледзелі ўсё — няма швоў!

А матрос Жураўка наважыўся завезці такое пудзіла дамоў, у свой порт. Падыходзіць да мяне:

— Таварыш боцман, як абсталяваць жывёліне вадаёмчык з прэснай вадою?

— У цябе галава ёсць? — пытаюся я.— На баявым караблі рабіць нейкі вадаёмчык? Камандзір што скажа?

— А я сам папрашу камандзіра. За такую жывёліну нашы вучоныя дзякуй нам скажуць.

Матрос Жураўка пайшоў да камандзіра карабля. Той выйшаў з каюты на палубу, паглядзеў на пудзіла і паведаміў:

— Гэта ж — качканос! Ён жыве ў вадзе і нясе яйкі...

— Ды не можа такога быць, таварыш камандзір,— усумніўся я.— Ні адна вадзяная жывёліна не нясецца.

— А вось качканос нясецца,— сказаў камандзір.— Адно што прэснай вады шкада. Але матросу Жураўку, боцман Краб, трэба дапамагчы. Вазьміце старую шлюпку, прымацуйце за кармавой гарматай... Наліце вады. Прынясіце глею, якой бузы з прэснага вадаёма. Травы кіньце на дно. Трава спатрэбіцца, калі раптам наш качканос знясе яйка...

Умацавалі мы шлюпку. Налілі ў яе вады. Прынеслі з берага глею і травы. Выпусцілі ў вадаёмчык качканоса. Насыпалі туды круп, каб не галадаў.

Дзень, два, цэлы тыдзень стаім на якары. Абы вольная хвіліна, бегаем глядзець качканоса. Ён, здаецца, патлусцеў, пабольшаў. Спадабалася наша крупяная падкормка.

Жураўка не адыходзіў ад той шлюпкі. І аднойчы падгледзеў — качканос знёс яйка. Маленькае такое, як невялічкая сліва. Празрыстае.

Я папрасіў прабачэння ў камандзіра, што пярэчыў яму. Слухаць бывалых людзей заўсёды трэба ўважліва. Калі не ведаеш чаго, то лепш памаўчы, чым сумнявацца ці не прымаць чые словы на веру.

Ну, знёсся качканос. І што з таго? Што ён будзе рабіць з яйкам?

Ды праз два дні матрос Жураўка нам дакладвае, што качканос знёс другое яйка.

Падыходжу я да шлюпкі паглядзець на тыя яйкі, а нічога не бачна. Качканос скруціўся ў клубок, накрыў іх сваім целам. Ніхто яго трывожыць не стаў.

Зняліся мы з якара. Ідзём і ідзём да родных берагоў. Менш увагі на таго качканоса. Прывыклі ўжо. Толькі цікавасць да рэдкай жывёліны не праходзіць у матроса Жураўкі.

І тут навіна!

— Боцман Краб, боцман Краб! — крычыць мне Жураўка.— Вылупіліся з яек маленькія качканосы!

Цікава! Падыходжу, гляджу. Немаўляты не падобныя на маці. Дзюба зусім маленькая, у роце ўжо

ёсць зубы. Чалавек вось нараджаецца бяззубым...

Камандзір карабля гаварыў, што з часам зубы ў маладых качканосаў выпадаюць. Але пабачыць тое на свае вочы не ўдалося.

У час паходу трапілі мы ў шторм. Неба завалакло хмарамі, аж цёмна стала. Над акіянам пранёсся смерч — вялікай сілы вецер. Карабель кідала стыхія, як саломінку. Качканосы выкінуліся за борт.

Пажурыўся Жураўка, пасумаваў. Ды што зробіш — у акіяне тых жывёлінак не знойдзеш.

У нас жа на караблі гаворкі было не на адзін дзень. Так мы і не прыйшлі да агульнай думкі: што такое качканос? Птушка? Рыба? Млекакормячая жывёліна?

Толькі камандзір карабля спыніў нашу спрэчку. Ён сказаў:

— Качканос і ёсць качканос!

## ПРЫЛІПАЛЫ

Здарылася гэта ў Ціхім акіяне.

Карабель наш стаяў на якары каля невялікага вострава. Каманда адпачывала.

Для тых, хто хацеў пабыць у субтрапічным лесе, спусцілі на ваду шлюпку. Неўзабаве прычалілі да берага. Матросы сышлі на сушу, а я застаўся ў шлюпцы.



Сяджу, драмлю і раптам адчуваю: шлюпка робіцца цяжэйшай, апускаецца ў ваду. Ужо амаль не зыбаецца. Што за дзіва?

Тым часам вярнуліся матросы. Паднялі якар. Селі на вёслы. Я даю каманду адчальваць, а шлюпка ні з месца. Як прывязаная.

— Можа, села на каралы? — глядзіць на мяне матрос Жураўка.

— Выраслі хіба? Пакуль вы на востраве бавіліся,— адказаў я.— Пад намі дна не відаць!

Жураўка ўглядаецца за борт, у празрыстую ваду:

— Рыба нейкая...

— Нырні, Жураўка! — прашу я.— Абмацай днішча.

Матрос адразу ў ваду. Вынырнуў праз некалькі хвілін і кажа:

— Рыба! Праўда, дзіўная нейкая — папрыліпала да днішча, галовамі адна да аднае. І не адарваць ніяк.

Тады я ўспомніў пра жыхарку субтропікаў — прыліпалу. Неяк, на рыбалцы ў моры, адна рыбіна прыліпла да халяўкі майго гумовага бота. Каля метра даўжынёю. Спалохаўся я: можа, джаліць, як гадзюка? І хутчэй на бераг! Ледзь адкараскаўся ад страшнай рыбы: цягну за хвост, а яна — не адрываецца. Мой камандзір, бывалы матрос, толькі пасмяяўся з такой нагоды. Аказваецца, прыліпалу трэба цягнуць не назад, а ўперад. Тады яна лёгка адрываецца. У старажытнасці, калі верыць легендам, вадзіліся буйныя прыліпалы. Яны спынялі нават судны, фрэгаты і іншыя парусныя.

Пра ўсё гэта я расказаў матросам у шлюпцы. Жураўка, а за ім і некалькі матросаў нырнулі ў ваду.

Яны вызвалілі ад прыліпалаў шлюпку, і мы хутка вярнуліся на карабель.

# СІВЫ ШЧУПАК

Многа розных шчупакоў я пабачыў на сваім вяку. Гэта рыба драпежная. Мае доўгі брускаваты стан, шырокія хваставыя плаўнікі для хуткіх і крутых паваротаў, выцягнуты ўперад рот, які Сяргей Аксакаў параўнаў з ткацкім чаўнаком. Частыя і вострыя ў шчупакоў зубы. Ніякая здабыча вырвацца з іх не можа. Шчупакі лічацца царамі драпежных рыб, якія водзяцца ў прэсных водах вадаёмаў і рэк. Бездапаможнымі яны бываюць толькі ў сярэдзіне мая кожнага года, калі змяняюць зубы.

У шчупака вялікія, цёмныя і зоркія вочы. Здалёк бачыць ён сваю здабычу. Луска ўсыпана плямамі і крапінамі цёмна-зялёнага колеру. Бруха мае белае. Хвост і плаўнікі — зеленавата-шэрыя.

Самы большы шчупак, якога мне давялося бачыць, важыў адзін пуд і трыста грамаў. Даўжынёю быў каля метра.

Шчупакі кормяцца рыбай, лягушкамі, пацукамі, качкамі, рознай рачной дробяззю. Водзяцца ж у чыстых, праточных водах. Ловяцца на вудачку.

Рыбакі расказваюць многа легенд пра хітрасць шчупакоў. Яны, маўляў, становяцца на мелкаводдзі і хвастом муцяць глей на дне, хаваючыся ў муці ад рыбак. Калі ж тыя набліжаюцца, яны хапаюць спажыву.

Шчупакі становяцца каля берага, плаціны, кораня ці палі, якія тарчаць у вадзе. І стаяць так гадзінамі, нярэдка блізка ад паверхні вады. Іх глушаць са стрэльбаў, нават каламі, як глушаць усякую рыбу па тонкім лёдзе.

А вось яшчэ пра сквапнасць шчупака. Рыбак, падсекшы невялікую рыбіну, раптам адчуў на вудзе цяжкасць. Але вудзільна не выпусціў з рук. І выцягнуў на бераг звычайную плотку, у якую ўпіўся зубамі вялікі шчупак. І так заціснуў здабычу, што давялося кіем расціскаць яму рот.

Аднойчы ледзь не сарвалася мая рыбалка. Узяў

я тры вуды з тоненькімі лёскамі. Выбраў мясцінку за лазовым кустом каля плаціны. Закінуў адну вуду. Пакуль нізаў чарвяка на кручок другой, вудзільна першай гайданулася, паплыло ў ваду. Падхапіў я яго, ані рыбы, ні кручка. Лёску перагрыз шчупак.

Неўзабаве гэта ж праява здарылася і з другой вудай — яна таксама засталася без кручка і канца лёскі.

Закінуў я трэцюю вуду. Пільна гляджу на паплавок. І пры першым руху паплаўка падсякаю рыбіну і выцягваю на бераг шчупака. Дома, калі сталі яго чысціць, у горле выявілі два маіх кручкі з канцамі лёсак.

Неяк у вусці Дняпра трапіўся на кручок сівы, амаль белы шчупак. Выцягнуў я яго на палубу карабля, развёў рукі. Што магло здарыцца з рыбінай?

Разгадаць загадку прыроды дапамог мне матрос Жураўка. Ён упэўнена сказаў:

— Шчупак ссівеў па старасці, таварыш боцман! Пра гэта пісаў яшчэ знакаміты пісьменнік і рыбак Сяргей Аксакаў!

Усё ж тады я напісаў ліст вучоным. Яны пацвердзілі тое ж самае: шчупакі сівеюць па старасці.

## ЖЫВАЯ ТАРПЕДА

Каманда наша правяла вучэбную трэніроўку. Ці, як кажуць на флоце, заняла баявыя пасты па гатоўнасці нумар адзін. Усё было, як у сапраўдным баі. Толькі не стралялі гарматы, не запускаліся ракеты.

У матросаў выдалася вольная хвілінка перад разборам трэніроўкі. Усе былі на баявых пастах.

І тут па карабельнай сувязі пачуўся голас вахценнага Жураўкі:

— Тарпеда! З левага боку тарпеда!

Гідраакустыкі таксама заўважылі на індыкатары сваёй станцыі светлую, незразумелую плямку. Яна імкліва ляцела на карабель. Уцякаць ад яе дарэмна.

Адкуль тарпеда магла з'явіцца ў акіяне — ніхто не задумваўся. І часу не было. Ды і падводныя лодкі ўжо выходзілі ў акіянскія глыбіні.

Камандзір карабля імгненна прыняў рашэнне:

— Тарпеду з левага борта расстраляць!

Камендоры павярнулі гармату. І стрэлілі па тарпедзе. Прадмет, які рухаўся на карабель, нічым іншым ім не ўяўляўся, як тарпедай ворага.

Але ў акіяне з вечнай гайданкай накрыць цэль, як кажуць матросы, не вельмі проста. Прамахнуліся камендоры яшчэ чатыры разы. Шосты снарад трапіў дакладна ў тарпеду.

Яна збавіла хуткасць, але ўсё ж дайшла да карабля, ударылася вострым носам у браніраваны борт. Ніякай шкоды нам не прычыніла. Адскочыла назад, толькі не патанула, як звычайная баявая ракета пасля сутыкнення з караблём.

— Жывая тарпеда! Жывая...

Матросы кінуліся да борта. І ўбачылі... Меч-рыбу!

Пра тое, што існуюць такія рыбы з моцнай верхняй сківіцай, я матросам расказваў. Меч-рыба атакоўвала амерыканскую чатырохмачтавую шхуну. Ударыла мячом у насавую частку судна. Прабіла дзірку, у якую хлынула вада. Давялося ўключыць помпы і рамантаваць шхуну.

Непадалёку ад Ліверпуля такая ж меч-рыба нанесла некалькі ўдараў па акіянскім лайнеры «Леапольд». Вада заліла трум. Лайнер выратавалі вадалазы, якія падаспелі на катэры.



Тады ж мы закінулі канат з пятлёю і выцягнулі рыбіну з мячом на палубу. Добра папрацавалі, да сёмага поту. Пакуль разглядалі акрываўленую тушу, наш карабельны кот Васька добра-такі асмакаваўся. Еў ён мяса і мурлыкаў. Наганяў нам апетыту.

А тут падаспеў і кок Бузук. Глянуў на ката і кажа:

— Мусіць, рыбіна вельмі смачная, калі так завіхаецца сыты кот Васька...

Бузук збегаў на камбуз, вярнуўся з сякерай. Ударыў па мячы — адно затупіў лязо.

Ён адсек кавалак мяса, паднёс яго да носа, добра вынюхаў. Кок быў спецыялістам у сваёй справе, ведаў толк у мясе і іншых прадуктах. Таму загадаў:

— Мяса ў халадзільнік!

Але ж боцман на караблі нешта значыць. Таму я таксама панюхаў і разгледзеў тое мяса. Нешта сярэдняе паміж маладзенькай свінінай і цяляцінай!

Тады і пагадзіўся з Бузуком.

## МАРСКІ МЯНТУЗ

Пра ментузоў, здавалася, я ведаў усё. Што ён водзіцца і ў маленькіх крынічных рачулках, і ва ўсіх вялікіх рэках, праточных сажалках і азёрах, якія маюць добрую, свежую ваду. Ён належыць да пароды драпежных рыб, бо пераважна харчуецца дробнымі рыбкамі. На выгляд мянтуз не вельмі зграбны. Рот у яго вялікі і шырокі. З ніжняй сківіцы, як шыльца, звісае доўгі вус. Ад яго пачынаецца белаватае бруха, якое ў вялікіх налімаў бывае круглае і абвіслае. Далей ён сплюшчваецца і заканчваецца доўгім, віхлястым плёсам.

Мянтуз не мае лускі, а пакрыты слізззю. Яго цяжка ўтрымаць у руках. Ён увесь мармуровы. Па цёмназялёнаму жаўтаватаму ўбранству раскіданы чорныя плямы. Вочы мае цёмныя.

У Дняпры я лавіў на вуду ментузоў да паўпуда.

Варылі з іх смачную юшку. Жанкі з ментузовай пячонкаю пяклі пірагі.

Мясцовыя рыбакі паказвалі мне вершу — прыстасаванне з вербалозавых дубцоў, сплеценае кругла, як мяшок. Павучалі, каб верша ляжала шчыльна на дне. Ментузы днём стаяць у ямах і завоінах. Ідуць па дне і трапляюць у пастку ноччу.

Мянтуз, як сцвярджаюць знакамітыя рыбакі, рыба рачная, прэснаводная. А тут матрос Жураўка пасярод Чорнага мора са шлюпкі злавіў пудовага ментуза. Выкінуў яго на палубу карабля, падняўся па трапу з вяровак і пытаецца:

— А што гэта за звяруга, таварыш боцман?

— Мянтуз! — адказаў я.— Толькі вельмі чорны. Мусіць, стары... Ды і не дужа трапяткі. І не вельмі слізкі... Такіх у Дняпры я ніколі не лавіў...

— Гэта — марскі мянтуз,— запэўніў прысутных камандзір.— У Дняпры ўжо вада застойваецца...

Жураўка падхапіў на рукі ментуза і панёс на камбуз.

## БЕЛЫ ВУГОР

У звычайных вугроў цёмны колер скуры. А тут нечакана на палубу з сеткі вытраслася белая змяя.

Матросу Жураўку, які нядрэнна ведаў марскіх і акіянскіх насельнікаў, здалося, што белая істота злосна сыкнула і выставіла танюсенькае жала. І смелыя, загартаваныя служакі, якім неаднойчы даводзілася глядзець смерці ў вочы, адступілі ад улову.

Рэдкае было відовішча. Матросы стаяць кругам, як дзеці ў дружным карагодзе. У цэнтры іх падскоквае толькі што вылаўленая рыба, пабліскваючы луской. Выгінаюцца доўгія і слізкія цёмныя вугры. А над імі — белая змяя.

Я выйшаў наперад, разглядаю белую загадку. І кажу Жураўку:

— Змяя гэтая падобная на вугра.

— А чаму ён белы, калі вугор?

— Таму, што вугроў трыста відаў! — настойваю я.— Давайце хуценька ачысцім палубу!

А матросы ні з месца.

Ды і сам я не ўпэўнены, што трапіўся незвычайны вугор. А раптам — змяя!

Зноў я прыдумаў. І загадваю Жураўку:

— Надзявай на рукі спяцоўкі і выкідвай змяю за борт!

Ён ажно жахнуўся:

— Такое дзіва выпускаць у мора? Ты што, боцман?

— Бяры тады змяю гэтую сабе запазуху! — зазлаваў я.

І ўсё ж выйсце са становішча падказаў Жураўка:

— А што, боцман, калі мы зловім гэтую змяю і змесцім у пусты бітон? Нальем вады. І завязем рэдкі экземпляр на бераг... Вучоныя, можа, дзякуй скажуць...

Пахваліў я Жураўку за прыдумку. Так мы і зрабілі. Даставілі жывым і здаровенькім белага вугра ў



Талін. І што гэта быў вугор, вучоныя пацвердзілі адразу. А чаму белы — розныя выказвалі здагадкі.

Бліжэй да ісціны, па-мойму, быў той з іх, які сказаў, што ў вугра парушыўся сінтэз пігменту скуры. Але як яно на самай справе — ніхто толкам не ведае.

## РЫБА-БЛІН

Больш распаўсюджаная яе назва — скат. А так — сапраўдны блін! Ёсць у яго звужэнне. Гэта — галава. Хвост жа ў выглядзе тонкай вяровачкі.

Зверху ў ската — падобныя на гузічкі два вочкі. Афарбоўка жоўтая, з чарнаватымі палоскамі і крапінамі. Чорная шчылінка-рот у ската



на белым жываце. Плавае ён над самым дном, падбірае рыбак, малькоў, малюскаў.

Знешне рыба-блін нагадвае жабу. Дык мы яе ніколі не смакавалі. Мясцовыя ж людзі бліны такія спажывалі.

## ТЫГРЫЦА

Матрос Жураўка злавіў гэтую незвычайную рыбіну ў вусці афрыканскай ракі Конга. З борта карабля закінуў вуду з нейкай прыманкай-рыбкай на кручку...

У акіяне поўна загадак. Як і гэтая прыманка: ні акунь, ні селядзец, ні стаўрыда, ні сардзіна. А даўжынёю так на мужчынскую пядзю...

Невядомую рыбу хто ж будзе есці! Таму Жураўка, як бы жартам, нанізаў тую невядомую і не вельмі прыгожую рыбку на кручок і апусціў яе ў ваду. І адразу ж здрыгануўся, закружыўся і пайшоў у ваду паплавок.

Жураўка паспрабаваў узняць вудзільна. Але яно не паддавалася. Наадварот, невядомая сіла цягнула яго ўніз. Не жартачкі — на прыманку клюнула рыба



вагою больш за два пуды. Як трыццаць пяць буханак хлеба, калі вы ўмееце лічыць. Пазней мы тую рыбіну паклалі на вагі.

А ў той момант спалоханы Жураўка паклікаў на дапамогу сяброў-матросаў. Яны хуценька апусцілі на ваду шлюпку. Сеткамі пасобілі госці падняцца на борт. Па-флоцку «ўзняць на борт» — значыць перакінуць здабычу з мора ў шлюпку ці на палубу карабля.

Жураўка адразу да яе, каб адчапіць кручок. А невядомая паласатая рыбіна тыгрыцай на яго. Зубамі ўчапілася ў далонь.

Кок Бузук, каб дапамагчы Жураўку, моцнымі касцістымі пальцамі паспрабаваў ёй перацiснуць горла. Дзе там! Страпянулася, пляснула хвастом невядомка! Яму самому акрывавіла руку!

Я з борта кінуў у шлюпку гора-рыбакам лінёк — не тоўстую, але моцную льняную вяроўку. Падказаў, каб зрабілі пятлю і зацiснулі тыгрыцу каля жабраў.

Так мы і ўзнялі паласатую рыбіну на карабель. На распаленай сонцам палубе нядоўга яна пляскала хвастом. Жыла столькі, колькі Жураўка і Бузук забавіліся ў медчасці, дзе ім зрабілі перавязку і далі кожнаму па ўколу ад стаўбняка.

А рыбіна хапіла ротам паветра і не звяла скіўіц.

Усе мы з цікавасцю разглядалі здабычу. Асаблівую ўвагу звярнулі на яе зубы. Яны былі доўгія, як запалка, і вострыя.

Здзіўляліся, чаму яна не перакусіла лёску? Магчыма, не зразумела, што з ёю здарылася, хто яе водзіць...

Пазней я вычытаў, што рыбіна-тыгрыца з атрада карпападобных і сямейства цітарынавых. Яна — самая крыважэрная драпежніца ў прэсных афрыканскіх вадаёмах. Бывалі выпадкі, што яна малым дзецям, якія купаліся ў рацэ ці на ўзбярэжжы акіяна, адкусвала пальцы, нават рукі. А такія здарэнні, калі яна крывавіла рыбаловаў, лічыць не пералічыць.

Памятку ад сваіх зубоў пакінула зубастая дра-

пежніца на руках у матроса Жураўкі і кока Бузука. Яны, здаецца, тым ганарыліся. Ды і мне, сказаць праўду, не падабаюцца тыя людзі, якія ўсяго на свеце баяцца.

## ЦІ СПЯВАЮЦЬ РЫБЫ?

Іншы раз чуеш: акіянскія глыбіні нямыя як рыба. Не верце гэтаму, дзеці. Акіян заўсёды жыве, гаворыць.

Сярод рыб вунь якія бываюць гаваруны! Толькі чалавечае вуха рэдка ловіць іх галасы.

Мне ж даводзілася чуць не адзін раз, як спяваюць рыбы.

Першая нечаканасць надарылася ў Індыйскім акіяне. Наш карабель стаяў на якары. Я дзяжурыў. Ноччу выйшаў на палубу праверыць вахценных.

Службы на месцы.

У паветры прахалода.

Невысокія хвалі б'юцца аб борт карабля.

Стаю, успамінаю былыя паходы. І раптам чую арганную музыку... Ажно мурашкі па спіне пабеглі.

Адкуль? Што?

Вахценныя таксама ўражаныя. З водных глыбінь вырываюцца то тонкі рытмічны гоман званоў, то акорды арфы...

Цёмнай ноччу сярод акіяна!

Пазней я даведаўся. Гэта спявалі рыбы, падобныя на камбалу. Яны прыліпаюць да бартоў караблёў, да скал. Матросы іх іншы раз ловяць рукамі.

У вучоным свеце «спевакоў» называюць «сабачымі языкамі». А чаму? Я не ведаю. Падабенства паміж рыбамі і языком сабакі амаль ніякага. Хаця паўкруглыя, пляскатыя.

Другі раз каля ўзбярэжжа Афрыкі нас цешылі акіянскія барабаншчыкі. Такі канцэрт узнялі ноччу, што маладых матросаў працінала дрыготка. Я нават

падумаў, што насоўваецца тайфун. Але неўзабаве грукат барабанаў змяніўся меладычным пошчакам. Каманда пераканалася, што ён сыходзіць з марскіх глыбінь. Супакоіліся хлопцы.

Пазней «барабанную музыку» лускаватых рыб мне даводзілася слухаць каля берагоў Цэнтральнай Амерыкі, у Міжземным моры. Уражанне яны пакідалі самае добрае.

Галасы ў рыб вельмі розныя. Яны выдатныя імітатары. Гукі марской цясаркі, калі яе выцягваюць з вады, напамінаюць то кудахтанне курыцы, то куванне зязюлі, то свіное рохканне.

Рыбы скрыгаюць, покаюць, рыкаюць, каркаюць, стогнуць, шчабечуць, пераклікаюцца паравознымі гудкамі. Для гэтага ў іх ёсць розныя апараты, прыстасаванні.

Рыбіны галасы ўтвараюцца трэннем зубоў адзін аб адзін, рэзанансавымі плавальнымі пузырамі, гукавымі костачкамі, шчэлепнымі накрыўкамі...

Рознымі гукамі рыбы аб'яўляюць аб знаходках ежы, аб з'яўленні ворага, аб занятасці падводнага акваторыя. Непаўторныя па сваёй меладычнасці нерастовыя песні жыхароў акіянаў і мораў.

Шкада толькі, што гукі большасці падводных спевакоў — слабыя, ледзь чутныя чалавечаму вуху. Хаця ёсць і такія, ад якіх узрываюцца акустычныя міны.

Аднойчы ў водах Мексіканскага заліва ўзняўся па баявой трывозе амерыканскі марскі флот. Гэта акунь-гарніст «зайграў» на сваёй дудзе. Вельмі блізка ад акустычнай міны. Яна і спрацавала.

А тут і другі выбух. На паверхню выплыў велікан гарніст-акунь. Падарваўся на акустычнай міне...

Заўсёды, дзеці, былі і застаюцца неспакойнымі акіянскія і марскія глыбіні. Сапраўды, спяваюць рыбы. Не верце нікому, што яны нямыя.

# ПАДЗЕМНЫЯ РЫБКІ

Прышвартаваліся мы да пірса, помню, у порце Пехвелі на Каспійскім моры. На маторцы ледзь прабіліся да прыстані паміж лодак, шлюпак, шхун і паруснікаў. Да нас, савецкіх матросаў, хлынуў іранскі люд. Гаварылі людзі хутка, што нават перакладчык не мог растлумачыць, чаго яны хочуць.

Бралі ж з нашых рук падарункі іранцы ахвотна. Нам прапаноўвалі розныя тавары і вырабы. Ды мы на тое нават не глядзелі. А дываны былі самаробныя — не расказаць пра іх словамі.

Нечакана ўзбоч тратуара мяне зацікавіў невялічкі акварыум, у якім плавалі незвычайныя ружовааранжавыя рыбкі. Цела ў іх было падоўжанае, амаль цыліндрычнае, без лускі. Яно прасвечвалася, бо цалкам пазбаўлена было знешняга пігменту. Не знайшлі мы ў рыбак вачэй. Ды іх і не было.

Са здзіўленнем мы назіралі, як рыбкі плавалі спіной угору, як усе звычайныя рыбы, і на баку, і нават брушкам да гарачага іранскага сонца. Яны не палохаліся прысутнасці людзей. Не ўцякалі ад сачка. Спрытна хапалі чарвячкоў.

Прыгожыя рыбкі, як аказалася, былі з пячораў, з падземных вадаёмаў. І называліся сляпымі гольцамі.

І Жураўка купіў рыбак. За плітку шакаладу далі іх каля дзесятка з невялічкім акварыумам.

Прынёс ён сляпых гальцоў на карабель. Клопатаў з імі аніякіх. Корм звычайны.

А радасці ў матросаў — па беражкі!

# МАРСКІЯ ДРЭВАТОЧЦЫ

Незлічоную колькасць пaруснікаў і шхун адправілі дрэваточцы на марское дно. І заставаліся таямнічымі невідзімкамі.

Сапраўды, на любое марское судна з глыбокай старажытнасці адбіралася лепшая драўніна. Як кажуць, ні сучка ні задзірынкі.

І выходзіла тое судна, скажам, у Чорнае ці Міжземнае мора. Яшчэ горш, калі ў субтрапічныя і трапічныя зоны якога акіяна. Праходзіў пэўны час. І аднойчы здаралася неверагоднае. Тыя адборныя дошкі ці клёпкі, скажам, сонны матрос незнарок прабіваў локцем. Вада з-за борта запаўняла судна. Яно ішло на дно. Каманда гінула.

Здарэнні такія доўгі час былі загадкай. Нарэшце ўдалося выявіць, што драўніну точаць карабельныя чарвякі. Так назвалі іх з-за выцягнутай формы цела.

Гадоў трыста таму назад днішчы суднаў і караблёў пачалі абшываць меднымі лістамі. Медзь ахоўвала ад чарвякоў і ад абрастання рознымі водарасцямі. Пазней з'явіліся фарбы з ядавітымі рэчывамі. Але ж вельмі не проста было запоўніць імі ўсе слаі драўніны. І чарвякі былі тут як тут!

Марскія дрэваточцы і сёння застаюцца загадкай для чалавека. Хаця цяпер ужо вядома, што іх лічынкі ў незлічонай колькасці адначасова пранікаюць у драўніну любой пароды і нават у прасмаленую фанеру. Хуткасць пранікнення ў драўніну і рост іх залежыць ад пароды дрэва. У дубовых дошках лічынкі развіваюцца слабей, чым у сасновых.

Раней мала што мы ведалі пра карабельных чарвякоў. Таму шлюпкі рамантавалі звычайнымі дошкамі, канапацілі і смалілі. Або фарбавалі звычайнай фарбай.

Адно лета мы доўга стаялі на рэйдзе каля Адэсы. Шлюпкі нашы на борт не ўзнімаліся. Матросы то прагульваліся ў мора, то праводзілі спаборніцтвы, то хадзілі да берага. А тут спатрэбілася неяк пера-

везці на карабель бочку з селядцамі. Прычаліла шлюпка да пірса, прышвартавалася.

Пашукаць трэба было трап і скаціць тую бочку. Дык жа лянота!

Матросы абвязалі бочку тросам. Але дрэнна заціснулі вузлы. І толькі абярнулі яе з пірса, а яна выкаўзнулася з абвязкі і ўпала ў шлюпку. Навылёт прабіла днішча. Добра, што не зачапіла нікога з матросаў, якія павінны былі яе прыняць.

Прыгледзеліся матросы да прабітага дна шлюпкі і заўважылі нейкіх дзіўных чарвячкоў. Так і выявілі дрэваточцаў.

Увесь драўляны марскі парк быў занава правераны і адрамантаваны. Ворагаў чарнаморцы сустрэлі ў поўнай баявой гатоўнасці.

## МАРСКІ МУЗЕЙ

Гарадам маіх сяброў я лічу літоўскі горад Клайпеду. А самай прыгожай мясцінай у яго ваколіцах называю Куршскую касу. Старой, аброслай цінай, ракавінай уяўляецца крэпасць Кагаліс. У ёй знаходзіцца марскі Музей з вялізным акварыумам.

Адпачывала мая душа па дарозе ад прыстані да Музея-акварыума. Нічога, здаецца, незвычайнага. Стаяць на беразе рыбалоўны траўлер і тралавы бот. Гэтыя судны пракладвалі клайпедскім маракам шлях у Паўночнае мора і ў Атлантыку, у Ледавіты, Ціхі і Індыйскі акіяны, да берагоў Амерыкі і самой Антарктыды. Не ўсе былі адкрывальнікамі новых земляў, але ж паўтарыць шлях, скажам, Калумба — таксама подзвіг.

Пры ўваходзе ў Музей — вялікія, цяжкія вароты. Яны як бы ўраслі ў агромністы, парослы травою земляны вал, які апаясвае самую крэпасць.

Уражвае сваім афармленнем галоўны бастыён, як тут называюць Музей-акварыум. І таму, што ў ім

сабрана вялікая калекцыя марской фауны. І таму, што перад уваходам у яго ў вальерах плаваюць або важна ходзяць, як чапурыстыя англійскія лорды, жыхары далёкай Антарктыды пінгвіны. Можна сказаць, уся каралеўская раць: каралеўскія, Адэлі і залатавалосыя. Ёсць такія пароды пінгвінаў.

Літоўскія рыбакі-энтузіясты скарацілі шлях да шостага мацерыка для тысяч і тысяч людзей. Асабліва многа ў Музеі-акварыуме дзяцей. Кожнаму хочацца пабачыць акіянскіх рыб. Глянуў я на пінгвінаў — як пабываў у Антарктыдзе!

У круглым акварыуме вольна, як у самім моры ці акіяне, паводзяць сябе асятры, бялугі, сяўругі, рапушкі еўрапейскія, рыбцы, камбала, палтус... Дарэчы, там я даведаўся, што самымі старажытнымі рыбамі з'яўляюцца іменна камбала і палтус, якімі некалі кішэла Балтыка.

У маленькіх акварыумах, якія такімі здаюцца на фоне агромністага басейна, пра які я ўжо гаварыў, плаваюць акуні, прытоена стаяць у завадзях драпежныя шчупакі, снуюць стронгі, краснапёркі, глыбінныя рыбы з ліхтарыкамі. У цемені яны самі сабе асвятляюць шлях.

Пабыў я дзень у Музеі-акварыуме — нібы зноўку агляну́ўся на ўсё сваё марское жыццё, занава праплыў усе моры і акіяны.

А пабачыць бы вам рака індыйскага ці вусача вялікага дубовага!

Ды і сома з чорнай спіною і жаўцізною пад брушкам, які некалі вадзіўся ў нашых рэках, таксама можна там убачыць, разгледзець яго вусы і дробныя вострыя зубы.

У марскім Музеі столькі цікавага, што вочы разбягаюцца. А чалавек неўпрыкмет адпачывае, напаўняецца прыгажосцю, становіцца больш шчодрым.

# ДЭЛЬФІНЫ

Пра іх многа гавораць і пішуць. Імі захапляюцца ў марскіх акварыумах. І некаторыя ў такой цікавасці да дэльфінаў бачаць сенсацыю.

У вучоных баляць галовы, каб даказаць, што далёкія продкі дэльфінаў жылі на сушы. Дык скажыце: хто ж яны такія?

Цяжка адказаць! Дэльфіны перасяліліся ў мора і змянілі сваё аблічча. А чаму яны пакінулі сушу з паветрам і сонцам, з зелянінай наўкола? Зубры ці быкі бадалі іх рагамі, спіхнулі з берага ў акіян?

Дэльфіны нараджаюць жывых дзяцей і кормяць іх малаком. Дык што — яны ўжо млекакормячыя? Куды ж аднесці тады астатніх кітападобных, якія таксама нараджаюць жывых дзяцей і кормяць іх сваім малаком?

Адны вучоныя лічаць, што дэльфіны пайшлі ад насякомаядных. Зубастыя, яны харчуюцца такім спосабам, як насякомыя.

Другія па будове вока і страўніку робяць дэльфінаў родзічамі парнакапытных. Родняць з тымі ж зубрамі і быкамі.

Я ж згодны з матросам Жураўкам. Дэльфіны, як усе жывыя істоты, падобныя самі на сябе. Бо інача́й,



скажам, колькі мільярдаў гадоў спатрэбілася б зямной жывёліне прыстасоўвацца да падводнага жыцця? Уявіце сабе: хуткасць руху дэльфінаў — да сарака кіламетраў у гадзіну. Яны як бы ўвінчваюцца сваім цыгарападобным целам у ваду.

Які бык ці зубр і за колькі мільярдаў гадоў зможа так пераўвасобіцца?

А нырае дэльфін на якую глыбіню! Трыста метраў! Тысячу, дзве тысячы метраў! Туды і назад! І ніякіх прыкмет страшнай для чалавека кесоннай хваробы!

Дэльфіны абыходзяцца без пітной вады. А без яе ўсё жывое на зямлі гіне раней, чым ад голаду.

Яны спяваюць, слухаюць, размаўляюць між сабою. У матроса Жураўкі быў запіс галасоў дэльфінаў-бялух. І ён сцвярджаў, што багатая гукавая сігналізацыя гэтых марскіх жывёл з'яўляецца іх мовай. Нічога дзіўнага ў яго здагадках я не бачу. Мазгі ў дэльфінаў крыху меншыя, чым у людзей. І большыя, чым у малпаў.

Жураўка быў упэўнены: людзі некалі змогуць гаварыць з прадстаўнікамі іншых відаў жывёл. З яго на караблі пасміхаліся. Раў бакі кок Бузук. А цяпер вядома, што амерыканскі вучоны ўстанавіў мову дэльфінаў — сістэму свістаў!

Гэта ўжо сапраўдная сенсацыя!

За ёю ж не забавілася другая сенсацыя. Нашы вучоныя адкрылі, што мова дэльфінаў — мова іх эмоцый. Яны ўмела гуляюць у розныя гульні. Адна з іх — гульня наперагонкі з караблямі і суднамі!

А самая ідавочная ісціна тая, што мы не ведаем дэльфінаў, як шмат якіх з'яў на зямлі, у яе нетрах і акіянах, у космасе. І чым больш вывучаем дэльфінаў, тым больш загадак узнікае.

Таму вам, дзеці, наказ: вывучайце прыроду, беражыце яе, каб не трапіць у ваду, як у бяду. Усё-такі мы — разумныя істоты на зямлі!

# КОЦІКІ

У тое лета наш карабель нёс вахту каля вострава Берынга. Там знаходзіцца самае вялікае на Далёкім Усходзе лежбішча коцікаў.

Мы былі сведкамі, як у пачатку мая на востраў прыплылі бацькі-секачы. З добрага бычка-пярэзімка кожны, калі вы бачылі гэтую жывёлу. Ды і знешнасцю, асабліва калі стануць на пярэднія ласты, яны нагадваюць бычкоў. Толькі галава ў коцікаў маленькая, урослая ў тоўстую шыю, якая зліваецца з тулавам.

Спачатку секачы ваююць за месца, на якім яны ляжалі ў мінулае лета. Так вызначыў матрос Жураўка, у бінокль назіраючы за коцікамі.

Чаму ён зрабіў такія вывады? На востраве былі больш сонечныя і раўнейшыя мясціны за тыя, за якія біліся секачы. Ды пра тое пісалі і вучоныя, кнігі якіх вазіў з сабою Жураўка.

За секачамі на востраў прыбылі коцікі-маці з маладняком. Узняўся такі гам-тарарам, што словамі яго не перадаць. Крычалі самкі. Раўлі секачы. Скуго-



ліў маладняк. У сярэдзіне чэрвеня ў гэтую бясконцую коцікаву сімфонію дабавіўся піск малых дзяцей.

Жураўку гэта зацікавіла. І ў вольны ад службы час ён пачаў наведвацца на востраў. Аднойчы прывёз адтуль ён на шлюпцы ледзь жывога чорненькага коціка-дзіцянё. На робе ў матроса засталася чорная поўсць. Нованароджаныя коцікі адразу пачынаюць змяняць сваё футра.

Знаток прыроды, Жураўка вызначыў, што дзіцянё засталося без маці. І не таму, што яе ў той момант не было каля малога. Маці пакідаюць іх часта нават на некалькі дзён. Выходзяць у мора і ад'ядаюцца рыбай. А малыя забаўляюцца на востраве, спускаюцца да вады, спрабуюць плаваць. І абавязкова зноў вяртаюцца на свае лежбішчы. Тут іх беспамылкова знаходзяць маці. Чужых дзяцей яны не прымаюць і не кормяць.

Чорненькі, як матросы назвалі ледзь жывога коціка, другі тыдзень не сыходзіў з месца, паміраў. Маці яго, пэўна, загінула ў моры.

Выпрасіў у мяне Жураўка кансерву згушчонага малака. Разбавіў яе вадою, падагрэў. Напаіў дзіцянё-коціка. Назаўтра яно само цягнулася да рук свайго выратавальніка, як бы прасіла ў Жураўкі есці. Моцна, пранізліва пачало пішчаць.

Дзіва нейкае! На востраве малыя коцікі па тыдню і болей не бачаць мацярок і не хочуць есці. А наш Чорненькі — як галадаміра! Давай і давай яму малако!

Дык Жураўка зазірнуў у даведнік. І вычытаў там, што малако коцікаў-маці дасягае тлустасці да сарака працэнтаў. У пятнаццаць разоў больш тлустае, чым малако, якое мы купляем у магазіне.

Дзіўная праява адбылася і з афарбоўкай нашага Чорненькага. Праз тры месяцы ён стаў серабрыстым, амаль сівым. А праз нейкі час апрануўся ў цёмна-карычневы кажух. Але для каманды ён ужо застаўся Чорненькім.

Увесь час, пакуль мы стаялі каля вострава Берынга, наш коцік быў на палубе. Пад'есць рыбы, за-

кіне пярэднія ласты за заднія, сагнецца-скурчыцца, як кажуць, у тры пагібелі. Ляжыць карчом-вываратнем. Спіць. Праўда, і праз сон усё чуе.

Чамусьці Жураўка адно выпусціў з-пад увагі. Равеснікі ж нашага Чорненькага паступова прызвычаіліся да жыцця ў вадзе. Ныралі, вучыліся здабываць корм. І восенню адплылі ў мора на зімоўку.

Затрывожыўся і наш Чорненькі. Аднойчы надвячоркам плюхнуўся за борт у ваду, і больш яго не бачылі.

## СІВУЧЫ

Спачатку мы, калі падыходзілі да вострава Берынга, прынялі іх за ахоўнікаў лежбішчаў коцікаў. І называлі вялікімі коцікамі. Але нас паправіў камандзір карабля:

— Сівучы!

— А чаму ж мірна ўжываюцца біялагічныя канкурэнты? — перапытаў я, стоячы побач з камандзі-



рам на капітанскім мосціку.— І коцікі, і сівучы — драпежнікі...

— Ужываюцца,— уздыхнуў камандзір карабля.— Пэўна, недурныя. Гэта чалавек на чалавека нарыхтаваў зброі...

І ён па трапе пайшоў уніз, у каюту.

Мы з Жураўкам назіралі, як вялізныя і кіжлаватыя на выгляд сівучы, пачуўшы, можа, шум вінтоў карабля, лёгка ўзбіраліся на гладкія, стромкія скалы. А некаторыя з іх ужо з вышыні каменем падалі ў ваду. Сівучы дэманстравалі не толькі спрыт і прыгажосць, але і смеласць.

Наша прысутнасць трывожыла сівучоў толькі першыя дні. Пасля яны сталі абыякавымі да карабельных заняткаў, самога карабля.

На востраве, аднак, сівучы блізка да сябе не падпускалі Жураўку. Хаця яму ўдалося разгледзець, што яны даўжынёю да чатырох метраў. І вагою яны здаліся Жураўку большымі за самага вялікага быка.

Ён не памыліўся. Пазней мы бачылі сівучоў у Ахоцкім моры. Яны залягалі на астравах Іоны, Ямскіх і Заўялава. Нярэдка на ўзбярэжных скалах заліваў Забіяка і Бабушкіна, у раёне Шантарскіх астравоў. Я ўжо не кажу пра Аляуцкую граду і Камандоры, дзе іх было многа, як і на Курыльскіх астравах.

## ГАРБУНЫ

З кітамі на моры ці ў акіяне нам жылося, як з добрымі, памяркоўнымі людзьмі. Жылося весела!

Стаіць карабель на якары. І раптам з вады выглядае аграмадзіна — галава кіта, падобная на камень-валун.

Кіт хутка ацэньвае абставіны. Толькі згледзіць гарматы — адразу ж крута згінаецца, робіцца гар-

батым. Бліскае спіною і нырае ў глыбіню. Праз колькі хвілін выглядае з вады ў другім месцы.

Няма кітабояў — пачынае весяліцца.

І саракатонныя, і стотонныя веліканы-гарбуны лёгка, як цацкі, узлятаюць над паверхняй вады. У паветры пераварочваюцца, кідаюцца на хвалі то бокам, то спіною. Як бы танцуюць, забаўляючы матросаў.

Збіраюцца гарбуны чародамі. Тады ўжо відовішча, што ні расказаць, ні апісаць.

Чаму весяляцца кіты на вачах ў людзей? Цяжка сказаць. Мову кітоў пакуль што ніхто не разумее. Ёсць здагадкі, што яны спраўляюць шлюбныя танцы. Выходзіць, што чакаюць нас каля берагоў Чукоткі ці Антарктыды, каб звярнуць нашу ўвагу на свае вяселлі.

Іншыя сцвярджаюць, што сваімі аглушальнымі ўсплёскамі аб ваду гарбуны глушаць рыбу. Але ж на паверхні мораў і акіянаў мала рыбы. Яшчэ менш яе каля ваенных караблёў з шумам матораў і вінтоў.

Ёсць і такое меркаванне: гарбуны, узлятаючы над вадою, ачышчаюцца ад розных малюскаў і водарасцяў.



Матрос Жураўка ўпэўнены, што гульні гарбуноў — ад прыроджаных сілы і спрыту, неўтаймаванасці.

Аднойчы гарбуны чарадою ішлі за намі ад берагоў Камчаткі ажно ў Індыйскі акіян. Падбіралі астаткі харчу, які кок Бузук выкідаў за борт.

Сталі мы на якар каля вострава. Мясцовыя кітабоі заўважылі гарбуноў, стрэлілі па іх з гарматы. Яны пайшлі на глыбіню. Натрапілі на сеткі з рыбай, выбралі ўлоў. І схаваліся на даляглядзе.

## КІТ І ЧАЙКА

Наш карабель стаяў на якары на ўваходзе ў вялікі порт. Было тое ў Атлантычным акіяне, у Паўночнай Амерыцы.

Матрос Жураўка вярнуўся са звальнення на бераг вясёлы і ўзрушаны. Расказаў мне, што бачыў у акіянскім акварыуме, як ручны кіт-касатка забаўляўся ў **«перацягванні каната»** са звычайнай шызай чайкай. Я тады не паверыў яму.

Але настойлівы Жураўка і другі раз, вярнуўшыся з берага, выказваў сваё захапленне відовішчам касаткі і чайкі. Так зацікавіў незвычайнай праявай сяброўства акіянскай жывёліны і птушкі, што я пайшоў паглядзець на іх.

Старая чайка стаяла на бетонным беразе акварыума і глядзела на ваду. І раптам перад ёю вынырнуў кіт. Раскрыў вялікі рот з доўгімі, рэдкімі зубамі. Дык чайка працягнула дзюбу і дастала з драконаўскай пашчы касаткі некалькі бліскучых рыбак, пракаўтнула іх адну за адной. Пасля яна ўчапілася яму за язык сваёй чорнай дзюбай. І кіт не спрабаваў вызваліцца ад яе. На вачах было тое «перацягванне каната», пра якое мне гаварыў матрос Жураўка.

Яшчэ большае было маё здзіўленне, калі чайка стала лапамі кіту на галаву. І ён павольна, як паню якую, павёз яе ад берага.

## ВЫРАТАВАННЕ КОЦІКА

У акіяне заўважыў у бінокль матрос Жураўка серабрыстую жывёліну. Коцік утрапёна біўся ластамі аб ваду і падаваў нейкія хрыплыя, жаласлівыя гукі. Карабель збавіў ход.

Зблізку кок Бузук разгледзеў у яго на шыі ржавае металічнае кольца. Магчыма, яно было ад рыбацкіх сетак. І малому коціку трапіла на шыю. Цяпер сціснула яму дыханне.

Што рабіць?

У маёй боцманскай гаспадарцы валяўся стары брэзентавы чахол. Прывязалі мы лінькі-яровачкі за рагі. Выцягнулі коціка на палубу. Ён асабліва і не трапятаўся.

Кок Бузук хуценька прынёс з камбуза сваю кухонную сякерку. Я падаў Жураўку ў рукі малаток.

Яны рассеклі кольца. І апусцілі ластаногага звярка ў акіян.

## ЛАХТАК

Нярэдка гэтага самага буйнога прадстаўніка сапраўдных цюленяў называюць марскім зайцам. Па зямлі ён скача, як заяц. Убачыўшы яго, кок Бузук крыкнуў:



— Заяц! Заяц!

— Жураўка ўсміхнуўся, лагодна адказаў:

— Сам ты заяц. Гэта — лахтак!

Вясёлы кок працягваў:

— Лахтак, русак, бяляк... Што вушэй няма ў марскога зайца... А так бы, каб...

— Каб ды каб, дык бы дожджык закапаў...

На гэтым спрэчка матроса Жураўкі з кокам Бузуком і закончылася.

Лахтак вырастае даўжынёю больш за два метры. Важыць столькі, як бык-пярэзімак.

Ён вельмі спрытны марскі звер. І моцны. Але рэдкі цяпер у морах і акіянах.

## КАЛАНЫ

Гэта адзіны прадстаўнік з сямейства куніц, які жыве ў моры. Некаторых каланаў называюць марской выдрай ці камчацкім бабром. Ну, для недасведчанага чалавека, сапраўды, усе яны падобныя між сабою, як лялькі розных памераў у дзіцячым магазіне.

Сярод сваіх суродзічаў каланы вылучаюцца асаблівай чысцінёй. Галоўны іх клопат — чысціня ўласнай скуры. Глянеш, бывала, раніцай у бінокль. Калан прычэсвае сваю поўсць і прыхарошваецца. У абед нават за ядою робіць тое ж самае. І вечарам.

Харчуюцца каланы ў асноўным марскімі вожыкамі. Нырае ў ваду, ловіць яго і выносіць на паверхню. Кладзецца на спіну і грызе. Адно калючкі, як шалупінне гарбузікавых семак, разлятаюцца ў бакі.

Пра каланаў ходзяць легенды. Кажуць, што ён падкаваны. І нібыта ўдараючы сваімі падковамі па мідыях, ён спрытна здымае іх з рыфаў — падводных узвышэнняў дна, якія небяспечныя для суднаходства і багатыя кармамі для каланаў.

Матрос Жураўка казаў, што каланы вельмі бяс-

печныя і падпускаюць людзей блізка да сябе. І спасылаўся ён на аўтарытэт вядомага даследчыка марскіх прастораў Літке. У мінулым стагоддзі ён, Літке, хадзіў з палкай па беразе і забіваў каланаў па выбару. Такім прымітыўным спосабам штурман Гаўрыіл Прыбыткоў на адкрытых ім самім і названых яго імем астравах упаляваў дзве тысячы марскіх баброў.

Скуры каланаў вельмі прыгожыя, моцныя і дорага каштуюць. Даўней багатыя людзі аббівалі імі сцены пакояў.

Выробленыя скуры каланаў служылі адзеннем для жанок Далёкага Усходу. Нярэдка іх нават не кроілі. Падразалі ніз і рукавы па росту.

Матроса Жураўку, калі мы сталі на якар каля непрыступнага, бязлюднага вострава Меднага, асабліва зацікавілі каланы. Але назіраць за імі доўгі час даводзілася здалёк, у бінокль. Аказалася, што яны на беразе бываюць вельмі рэдка. І цяпер ужо баяцца чалавека. Дык адразу, як згледзяць што ці пачуюць які гук, ныраюць у мора.

Каланы любяць сваіх дзяцей, як ніхто, мусіць, з марскіх жывёл. Рэдка яны ў іх нараджаюцца. Дык маці тады з дзіцем не развітваецца. Песціць, лашчыць. Садзіць сабе на грудзі, лёгшы на спіну, доўга забаўляецца.

## АКІБА

Знешне гэты марскі звярок з сямейства цюленяў нагадвае птушку. Таму, згледзеўшы акібу на льдзіне, кок Бузук крыкнуў:

— Якая прыгожая птушка!

Матрос Жураўка адразу яго паправіў:

— Цюлень акіба. Няма ж у яго дзюбы. На мордачцы, глядзі, вусікі, як у гогалеўскага Наздрова.

Папрасіў я бінокль, каб разгледзець і самую акібу, і яе вусы. А яна — акіба, ці кольчатая нерпа,— каўзанулася са льдзіны ў ваду.



Пазней мне неаднойчы даводзілася назіраць за гэтым прыгожым, падобным на рыбіну, марскім звярком. Акіба водзіцца ва ўсіх далёкаўсходніх морах. Няма яе толькі чамусьці ў Японскім.

Футра акібы і прыгожае, і зносу не мае. Таму яно дорага каштуе і прадаецца на валюту.

Дзяцей акіба выводзіць ранняй вясною, на льдзіне каля праталіны. Яны нараджаюцца ў белым, пушыстым, цёплым і мяккім кажушку. Даўжыня цела акібы-дзіцяняці дасягае палавіны даўжыні мацеры. Гэтая асаблівасць мае пэўны біялагічны сэнс. Дзеці акібаў, як і іншых цюленяў, прыстасаваны да нізкіх тэмператур Поўначы. Хаця бываюць выпадкі, што малыя і замярзаюць. Аднойчы ў праталіне матрос Жураўка знайшоў нежывую акібу. Поўсць на ёй была ўжо і не белая, але яшчэ і не жоўтая з крапінамі.

## ДЗІЎНЫ КРАБ

Было гэта ў Міжземным моры. Матрос Жураўка, нырнуўшы глыбока ў ваду, падняў на борт карабля незвычайнага краба. З прырослай да панцыра марской губкай.



Гэта нас вельмі зацікавіла. Праз колькі дзён Жураўка з марскога дна дастаў краба, які ў сябе на спіне трымаў заднімі лапкамі вялікую губку. Яна яшчэ не паспела прырасці да панцыра.

Крабы, аказалася, маскіруюцца ад драпежнікаў жывымі губкамі. Адно пры з'яўленні якога марскога разбойніка яны хутка вызваляюцца ад лішняга груза і хаваюцца ва ўкрыццё.

Бачылі мы, як крабы падразалі губку, калі яна разрасталася і звісала з панцыра. Працавалі клюшнямі, як нажніцамі.

Матрос Жураўка прыкмеціў таксама, што ў час руху краба губка шмат спажывала харчу і хутка расла.

## КРАБ І АКТЫНІЯ

Жураўка на тым жа пляжы выявіў яшчэ аднаго незвычайнага краба. У сваіх клюшнях ён трымаў маленькіх жывых актыній, якія адначасова служылі яму і сродкам абароны і нападу на іншых марскіх насельнікаў.

Мы назіралі, як актыніі лавілі рыбак і малюскаў, а краб забіраў сабе ад іх здабычу. І адбывалася ўсё як бы добраахвотна, па згодзе.

Аселая жыхарка мора актынія як бы плаціла крабу за падарожжа ў яго на спіне.

## СІНЯПЁРКА

Гэтую прыгожую, вялікую рыбіну я злавіў на вуду ў вусці Амура. У яе было сціснутае з бакоў цела, шэрае, ажно зеленаватае! З плямамі рознай велічыні. Брушка светлае. Верхні, анальны, і хваставы плаўнікі зеленавата-жаўтавата-чырвоныя з чорнымі крапінамі. Грудны — чырвоны з вялікай калючкай. На яе Жураўка пракалоў сабе далонь. Але ўсё ж зважыў і змераў даўжыню рыбіны. Важыла яна роўна паўпуда. А даўжынёю была семдзесят сантыметраў.

Доўга мы высвятлялі назву гэтай рыбіны. Панеслі ў сумцы ў рыбалавецкі порт. І толькі адзін стары рыбак сказаў, што гэта — сіняпёрка. Для мясцовых жа жыхароў яна — аўха, або кітайскі акунь. Драпежная рыба! Раней многа сіняпёрак вадзілася ў прэсных вадаёмах і рэках Далёкага Усходу. Смачная рыба! Дык і вылаўлена людзьмі.

Цяпер сіняпёрка ўзята пад ахову, занесена ў Чырвоную кнігу.

# ЗАГАДКА АНТАРКТЫДЫ

Колькі ні глядзі на акіян, ён заўсёды адкрывае нешта новае...

Карабель наш ішоў у Антарктыду. Да льдзін, у якіх дрэйфавала наша плывучая лабараторыя, было яшчэ далёка. На світанні выйшаў я на палубу. Вахценныя на месцы. Сіпіць, паблісквае блакітнымі іскрамі вада за кармой. Залацістымі пчоламі раіцца зорнае афрыканскае неба.

І раптам... У хвалях мільгаюць, плывуць насустрач караблю чорныя, бліскучыя істоты.

Вахценны дакладвае дзяжурнаму па караблі:

— Наперадзе па курсу... Львы...

І глядзіць на мяне.

Я ўжо бачу буйных, пакрытых чырвона-бураватай поўсцю жывёл. Яны то плывуць, то высока, як дэльфіны, падскокваюць над вадою. Добра бачны ўжо іх вострыя мордачкі, апушчаныя вушы, калючыя вусы.

— Ну, боцман, я не памыліўся? Львы?..

— Канечне, львы! — пацвярджаю я.

І вахценны ўдакладняе дзяжурнаму:

— Па курсу прама — львы! Вось і боцман кажа...

А дзяжурны па караблі з капітанскага мосціка па моцнай сувязі:

— Ды гэта ж марскія капскія коцікі, таварыш боцман!..

Я ўзяў у вахценнага матроса бінокль. Так, да карабля падплылі антарктычныя коцікі. Я прашу ў кока Бузука астаткі ад учарашняй вячэры, сухары. Вывальваю ўсё гэта з вядра за борт. Коцікі накідваюцца на спажыву.

Пазней Жураўка сказаў, што яны кормяцца рыбай. Але не грэбуюць і дарункамі матросаў.

Гэта была першая загадка Антарктыды.

# ЦУД ТРОПІКАЎ

Большасць дрэў, пра якія я раскажу, адносяцца да трапічных краін. Некаторыя з іх сустракаюцца і ў нашых айчынных аранжарэях. Так, у садах і парках Крыма, Каўказа, Сярэдняй Азіі можна знайсці прыгожае дрэва — балотны кіпарыс. Яно хваёвае. У гэтага дрэва замест звычайных каранёў развіваюцца так званыя дыхальныя карані — порыстыя стрыжнепадобныя наросты, якія паднімаюцца вертыкальна ў паветра ад падземнай карнявой сістэмы. У губчатых тканінах маюцца шматлікія праходы — па іх паветра пранікае да падземных каранёў.

У тропіках ёсць дрэвы сукуленты. Яны хаваюць пад шчыльнай абалонкай сакавітыя тканіны, у якіх назапашваюць вільгаць. А каб зменшыць выпарэнне пад промнямі зыркага сонца, часта іх лісты пераўтвараюцца ў калючкі.

Да сукулентаў таксама адносяцца кіпцюрыстае дрэва, якое расце на Мадагаскары, і агурэчнае дрэва, якое сустракаецца на востраве Сакотра. Гэта адзіны член сямейства гарбузовых, які стаў дрэвам з калючымі лістамі і пладамі, якія вельмі падобныя на агуркі.

Ёсць у тропіках каўбаснае дрэва, плады на якім нагадваюць ліверную каўбасу. З яго драўніны мясцовыя жыхары вырабляюць посуд, розныя ўпрыгожванні.

Многа цікавага можна расказваць пра баабабаў — самых каштоўных з афрыканскіх раслін, пра аўстралійскае бутэлечнае дрэва, якое збірае вільгаць у сваім ствале, і трапічную сейбу, якая дае шаўкавістыя валокны.

Сярод драўнінных парод бальса лічыцца «чэмпіёнам» у самай лёгкай вазе. Яго кубічны дэцыметр важыць усяго сто дваццаць грамаў, што амаль у два разы менш, чым кара коркавага дрэва. Як вядома,

славуты нарвежскі этнограф і вандроўнік Хеердал свой плот «Кон-Цікі» змайстраваў з бальсы.

На заходнім узбярэжжы Паўночнай Амерыкі растуць секвойя і мамантавае дрэва, якія дасягаюць вышыні ў сто метраў і ў дыяметры да дзесяці. Дажываюць яны да чатырох тысяч гадоў.

Але самым высокім і тоўстым дрэвам на Зямлі была малпіна калючка, якая расла ў Паўднёвай Афрыцы. Вышынёй яна вырастала за сто дваццаць метраў, а ў перыметры ў аснове была каля пяцідзесяці метраў.

Ёсць дрэвы, якія паказваюць час і прадказваюць надвор'е, даюць ваду, малако і соль, вымаўляюць гукі, ляскаюць лістотай і здзіўляюць іншымі незвычайнымі якасцямі.

Спадзяюся, што я абудзіў цікавасць да жыцця дрэў, выклікаў павагу да гэтых цудаў прыроды.

## ЭЎКАЛІПТАВЫ ЧЭМПІЁН

У багатым на экзотыку Сіднеі — вялікім партовым горадзе на ўзбярэжжы Аўстраліі — нам вельмі спадабалася святочнае спаборніцтва на лепшага лесаруба. Дужыя мускулістыя мужчыны і хлопцы ў бялюткай спартыўнай форме ссякалі бліскучымі сякерамі жаўтаватыя эўкаліптавыя слупы, якія ўстаноўлены былі на гарадской плошчы. Вышыня слупоў з трохпавярховы дом. Да кожнага прымацаваны тры дошкі, якія ўстаноўлены па акружнасці.

Слуп нагадвае эўкаліптавае дрэва з сукамі.

Спартсмен-лесаруб залазіць на самую высокую апору з дапамогай сякеры. Убівае яе ў ствол і падцягваецца. Як толькі трымаецца на вузенькай дошчачцы на такой вышыні! Але ж лесаруб не толькі стаіць, ён пляжыць сякерай цвёрдае дрэва з розных бакоў!

Пераможца спрытна саскоквае на дол і танцуе. Натоўп пляскае ў далоні.

Другі лесаруб паўтарае тое ж самае на другой, сярэдняй, прыступцы-дошцы. Трэці — ніжэй. Усе пераможцы атрымліваюць каштоўныя падарункі. Таму завіхаюцца з такой заўзятасцю, што за імі не ўгоніцца, здавалася, ні адзін сапраўдны лесаруб!

А тут наш карабельны кок Бузук паглядзеў на іх і мне сказаў:

— Не ўмеюць яны, таварыш боцман, ссякаць дрэвы.

З пэўным недаверам я глянуў на яго, усміхнуўся. Жартаваць, маўляў, усе мы майстры. А звалодаць з эўкаліптам не вельмі проста. Але крыўдзіць Бузука таксама не хацелася. Добры ён і кок, і чалавек. Да службы працаваў вальшчыкам лесу ў леспрамгасе на Ангары. З выгляду худы, жылісты. Але дужы. На адной руцэ тры разы падцягваўся на перакладзіне. З двухпудовай гірай забаўляўся, як з мячыкам.

— Хочаш і ты прыняць удзел у спаборніцтве? — спытаў я кока, не думаючы, што ён адважыцца на такое.

Бузук ажывіўся:

— Калі б вы, таварыш боцман, дазволілі...

— А дзе ты возьмеш сякеру? — спытаў я, усё яшчэ не верачы, што кок на самай справе запаліўся спаборніцтвам.

— Збегаю на карабель, таварыш боцман! — адказаў мне Бузук.— У мяне заказная сякера! Хлопцы зрабілі ў майстэрні! Можна галіцца!.. Гэтыя гора-лесарубы не працавалі ў лесе. Яны крута ставяць сякеры. Папярок валокнаў дрэва ніхто не сячэ...

Маладзецкасць і зухаватасць матросаў мне заўсёды падабалася. Усякую іх талковую ініцыятыву, дзелавую прапанову я стараўся падтрымаць. Адпусціў я Бузука на карабель. Непадалёку ад відовішча купіў яму белую майку і белы спартыўны абутак. Белыя флоцкія штаны ад формы падыходзілі для спаборніцтва без замены.

За невялікую плату знайшоў я старога аўстралійца, які пагадзіўся пад выглядам свайго сына ўключыць Бузука ў спаборніцтва.

Вярнуўся Бузук. У раздзявалцы на пляжы пераапрануўся пад аўстралійскага спартсмена. Сунуў сякеру ў футарал ад нейкага музычнага інструмента, які знайшоў стары аўстраліец. Ён і павёў кока на пляц спаборніцтваў.

Я крочыў следам за Бузуком і дзедам, запрашаючы матросаў, каб ішлі глядзець відовішча. Ды каманда і так ведала свайго кока. Толькі ніхто з матросаў не разумеў, што ён, Бузук, будзе рабіць на плошчы. Некаторыя адкрыта пасміхаліся: маўляў, чым здзівіць кок гулякаў на плошчы?

Бузук з дзедам прайшлі да замацаваных у зямлі слупоў эўкаліптаў.

Кок зацікаўлена разглядаў няхітрыя прыстасаванні для забавы публікі.

Нас туды не пусцілі. Мы стаялі перад невысокім бар'ерам і ўважліва назіралі, як наш кок дзелавіта прымерваецца сякерай да ствала дрэва, да лініі на ім, па якой трэба нанесці першы ўдар.

Выглядаў Бузук нейкім вялым, стомленым, як разгубленым. І мне было падумалася, што дарэмна аддаў апошнія долары на яго забаўку.

І вось — сігнал! Сякеры адначасова ўзняліся ў паветра, бліснулі сталлю, упіліся ў эўкаліптавыя слупы.

Самы чыстазвонны быў гук ад удараў Бузука. Ён працаваў старанна і рытмічна.

Неўзабаве ў яго суседа, спартсмена-аўстралійца, заклінілася сякера. І хаця ён не выключаўся з гульні, але страціў дарагія хвіліны. Не мог ужо разлічваць на першае месца.

Другі аўстраліец малаціў па дрэве з перабоямі. Без рытму ў такой барацьбе не пераможаш.

Уся ўвага людзей і суддзяў, нашых матросаў — на Бузука. Рэпарцёры загадзя фатаграфавалі старога, як бы бацьку нашага кока. Ну, і не кока, а як бы сапраўднага аўстралійца.

Ды раптам Бузук запыніўся. Узняў руку і пашавяліў пальцамі, як пры здранцвенні. Натоўп замёр. Маё сэрца таксама ёкнула.

Было зразумела, што ад напружання і хвалявання коку звяло руку. Але на адно імгненне. Ён крутануўся да нас спіною і з новай сілай пачаў шчапаць цвёрды эўкаліпт.

Бліскучыя, як залатыя, трэскі падалі на травяністы дол. За імі неўзабаве паляцеў і глуха бухнуўся на пляц адсечаны Бузуком канец эўкаліпта.

Першым расправіўся з дрэвам наш кок! Саскочыў на зямлю і пачаў танцаваць барыню. Матросы яму дапамагаць сталі. І так выдалі сябе, што яны чужыя, рускія! А значыць — не маюць права прымаць удзел у свяце.

Суддзі звярнуліся да ахоўнікаў парадку. З'явіліся паліцэйскія і акружылі Бузука. А кок не разгубіўся. Паказвае на старога аўстралійца і кажа:

— Аддайце яму мой чэмпіёнскі ганарар! Мне хацелася паказаць, якія дужыя і спрытныя ў нас на караблі матросы!

Пасля непрацяглай валынкі мы развіталіся з аўстралійцамі.

## ВАЛОДЗЬКА З «БЕЗДАКОРНАГА»

Гэта адбылося на Чорным моры. Мяне перавялі служыць на эскадраны мінаносец «Бездакорны».

Пад агнём варожых батарэй мы прарываліся ў асаджаны Севастопаль. Прывозілі туды абаронцам горада папаўненне, боепрыпасы, харчы. Забіралі параненых, жанчын, дзяцей.

На капітанскім мосціку побач з камандзірам карабля заўсёды быў яго сын Валодзька. Прыгожы, кемлівы, смелы хлопчык. Як і бацька, ён ніколі не хаваўся ў час налётаў варожай авіяцыі. Больш таго, Валодзька з аўтамата цэліўся і страляў па самалётах. Канечне, кулі не даляталі да цэлі. Але што зробіш, калі нянавісць да гітлераўцаў перапаўняла яго маленькае і адважнае сэрца?!

Шкадавалі і любілі мы Валодзьку. Перад апош-

нім паходам, калі малы быў на камбузе, я сказаў камандзіру:

— Чаму вы не пакінеце сына ў Новарасійску?

— З ім нельга пра гэта гаварыць. Валодзька не хоча пакідаць карабель. Уцякае ад бабулі.

— Няхай бы маці прыгледзела.

— Яна з меншай дачкою ў Казані. Валодзька перад адпраўкай уцёк з вакзала, каб быць на караблі.

Я звярнуўся да камандзіра яшчэ раз:

— У паходзе можа ўсякае здарыцца...

— Не бойцеся, боцман! — усміхнуўся Валодзькаў бацька.— Мы вернемся! Цяпер ужо нельга пакідаць яго на беразе. Што падумае каманда? Камандзір баіцца новага паходу? Баіцца, што не вернемся, калі пакінуў сына на беразе?

Мінаносец рассякаў зеленаватыя валы хваль, пакідаючы за сабою белы шлейф пены. І ноччу, і раніцай усё было ціха, спакойна. Штыль на моры. Адно камендоры былі на сваіх баявых пастах.

Толькі пасля абеду гітлераўскія лётчыкі выявілі нас. Атакавалі карабель.

Густым агнём сустрэлі іх нашы зенітчыкі. Хутка, спрактыкавана працавалі матросы. Зенітчыкі збілі адзін варожы бамбардзіроўшчык. Не выйшаў ён з піке, урэзаўся ў ваду.

Валодзька ажно скакаў ад радасці на капітанскім масціку. Бацька пагладзіў яго па галаве.

— Малайчына, сынок! Бі фашыстаў!

Гэта было сказана так, нібы Валодзька з аўтамата збіў тое цёмнае страшыдла ў небе.

Праз колькі гадзін варожая атака на «Бездакорны» паўтарылася. Наперадзе карабля, амаль пад самым кілем, падалі варожыя бомбы. Прыцэліцца фашыстам не давалі нашы зенітчыкі.

Камандзір з масціка падаваў каманды. Валодзька страчыў па самалётах з аўтамата. Смелыя былі людзі.

З новай атакай гітлераўцы не замарудзілі. З-за чорнай хмары надвячоркам вынырнула некалькі піруючых бамбардзіроўшчыкаў. Прарваліся праз

зенітны заслон. Скінулі бомбы на карабель. Корпус разламаўся. Кармавая частка пачала апускацца ў ваду. Матросы хутка перабраліся на бак. Камандзір і Валодзька былі на мосціку.

Атака фашыстаў паўтарылася. Карабель пачаў тануць. Ад шлюпак засталіся толькі аскабалкі, якія плавалі па вадзе. Камандзір загадаў усім падвязваць выратавальныя камізэлькі, пакідаць мінаносец. Сам стаяў і глядзеў, як кідаецца ў халодную ваду каманда.

Не ўсім матросам удалося адплысці ў бяспечную зону. Некаторых адразу каля бартоў хапаў і паглынаў бурун...

Мне ўдалося выратавацца. Я добры быў плывец і без выратавальнай камізэлькі трымаўся на вадзе. Столькі жахаў нагледзеўся!..

Камандзір і Валодзька заставаліся на мосціку. Калі і ён схаваўся, бацька падхапіў на рукі сына. Так і пайшлі на марское дно адважныя людзі. Праз колькі хвілін іх накрыў ваенна-марскі флаг.

## НА «ТАШКЕНЦЕ»

Служыў я на лідэры «Ташкент». Перад самай вайною з'явіўся такі карабель-прыгажун на Чорным моры. Ім нельга было не любавацца.

Мачты і трубы адхілены назад, як у скакуна грыва.

Бак — пярэдняя частка карабля — прыўзняты, як самалёт на ўзлёце.

Першая мачта зраслася з крыламі капітанскага мосціка. Узнятая шабля над галавою імклівага коннага ездака!

Рубка — абцякальная. Ну, кабінка сучаснага «Масквіча»!

Фарштэвень — востры. Няма з чым параўнаць.

Абводы паўбака — тонка згладжаныя...

Усё падкрэслівала імклівасць і хуткасць карабля. А ўзвышаныя над палубай гарматныя вежы і тарпедныя апараты давалі ўяўленне пра яго агнявую сілу.

Блакітная афарбоўка «Ташкента» вылучала яго з шэра-сініх караблёў флота.

Даглядалі матросы свайго прыгажуна. Мне, боцману, лёгка служылася. Усё ж новенькае...

А каманда падабралася! Хлопцы-асілкі! Кожны ў агонь і ваду гатовы ў любую хвіліну.

І тут вайна. Сталі мы на баявую вахту. Адбіваліся ад варожай авіяцыі. Уступалі ў бой з артылерыйскімі батарэямі гітлераўцаў. Канваіравалі транспарты ў асаджаную Адэсу.

Цяжка было абаронцам горада. З трох бакоў яго абступалі ворагі. Адкрытым заставалася толькі мора. Але ж бераг пад прыцэльным агнём фашыстаў. У небе чорным груганнём віселі іх самалёты.

І ўсё ж нашы караблі прарываліся ў гарнізон. Падвозілі папаўненне, бензін. Забіралі параненых, жанок, дзяцей. «Ташкент» мужна нёс баявую вахту.

Ніколі мне не забудзецца апошні паход на «Ташкенце». Вечарам мы пакінулі Севастопаль, пайшлі ў мора. Узялі курс на Адэсу.

Шторм затухаў, але яшчэ за бортам белымі валунамі перакочваліся ўспененыя хвалі.

Раніцай мора паспакайнела. Пацягнула на дрымоту. Ды ніхто не спаў. На вайне мы ніколі не даверяліся цішыні.

Надвячоркам убачылі бераг. Адэса гарэла. І змагалася. Вогненнымі znічкамі ўспыхвалі стрэлы з гармат і зенітак нашага гарнізона.

На ўвесь Чарнаморскі флот грымела слава марскога палка, якім камандаваў мой сябрук Якаў Осіпаў. Гітлераўцы проста жахаліся штыкавых атак.

Мы ганарыліся імі. Тым больш што ў палку былі пасланцы з нашага «Ташкента»...

Але нядоўга мы разглядалі Адэсу, якая гарэла і змагалася. Нас, караван караблёў, заўважылі гітлераўцы. Вакол лідэра ўзняліся вадзяныя слупы.

Трэба было ратаваць транспарты. Хуткі «Ташкент» сігануў паміж берагам і караблямі, пакінуўшы за сабою густы шлейф дымавой завесы.

Караван схаваўся. Варожыя батарэі паляць наўздагад. Проста выпускаюць снарады.

Чорным покрывам навісла над морам ноч. Толькі над Адэсай і яе прыгарадамі не затухала зарыва пажарышчаў. Не змаўкала страляніна.

Пад грымоты кананады транспарты падышлі да берага, прычалілі. Пачалі разгружацца.

Мы на «Ташкенце» адышлі ў мора. Чакалі новага загаду. А тут радыст злавіў сігнал «SOS», «SOS», «SOS»! Памажыце, памажыце, памажыце!.. І называліся каардынаты. Тое месца, дзе карабель напаткала бяда.

Наш «Ташкент» паспяшаўся на выручку. Цераз міннае поле, хоць гэта была вялікая рызыка. Але, здаецца, камандзір прыняў правільнае рашэнне.

Мы падышлі да тральшчыка. Толькі кармавая частка яго тырчала над морам. Уключылі пражэктар, прышвартаваліся да тральшчыка. Парушылі, зразумела, рэжым святламаскіроўкі. Ды ўся наша ўвага была скіравана на адно: ратаваць людзей!

З тральшчыка на «Ташкент» перагружаліся людзі, скарб...

Чым больш грузаў зносілі з тральшчыка, тым вышэй угору задзіралася яго карма. Карабель трапіў на міну. Некалькі адсекаў адразу запоўніла вада. У іншыя яна цадзілася праз шчыліны ў пераборках — перагародках паміж адсекамі.

Разгрузка была скончана.

Я стаяў на карме тральшчыка, чакаў каманду камандзіра, каб адкрыць кінгстоны — адтуліны для затаплення карабля.

І тут на «Ташкенце» пачуўся крык жанчыны, якая апрытомнела:

— Максімка!.. Сынок!.. Спіць у кубрыку! Максімка!.. Ратуйце!..

Хвіліны застаюцца да поўнага затаплення тральшчыка. Але ж там дзіця!

Па крутым трапе я сігануў у кубрык. Вобмацкам знайшоў у цемені хлопчыка, загарнуў у коўдру.

Вада ўжо пералівалася праз люк, калі мы ўзнімаліся з кубрыка. Перадаў я дзіця на «Ташкент». А сам адвязаў на тральшчыку швартовы, кінуў стальны трос у ваду. Адкрыў кінгстоны тральшчыка.

Карма рэзка сiганула ўгору. Я не ўтрымаўся на палубе. Баўтануўся ў халодную марскую ваду.

Хутка падплыў да свайго лідэра. Узняўся на борт. Каюты і кубрыкі забіты жанкамі і дзецьмі. У мокрым адзенні застаўся на палубе.

У паходзе прастудзіўся. Прыхапіў двухбаковае запаленне лёгкіх.

У Севастопалі мяне паклалі ў шпіталь. Кожны дзень сюды наведваліся Максімка і яго маці. Я папраўіўся, пайшоў служыць на другі карабель.

Апошнім транспартам з Севастопаля яны эвакуіраваліся ў Новарасійск. Адтуль — ва Узбекістан.

Пасля вайны знайшлі мяне... Цяпер мы як родныя.

## БЕЛЫ МЯДЗВЕДЗЬ

Аднойчы летам марская служба закінула мяне ў Арктыку.

Наша драўляная хатка стаяла на самым беразе фіёрда, як завуць марскія затокі з вельмі крутымі скальнымі берагамі.

Дык вось, адчынілі мы раніцай хатку, а перад намі белы мядзведзь. Прыгожы, спакойны. Як бы памяркоўны. Хоць падыдзі і гладзь рукою, як аб'езджанага каня. Але ж белы мядзведзь — грозны драпежнік!

Глядзелі мы на яго. А ён, прынюхваючыся, махаў галавою, разглядаў нас. Адразу ўразілі яго тоўстыя, як тумбачкі, лапы.

Мядзведзь паўзіраўся на нас і, нібы адчуў, што нам трэба на службу ў горы, паволі пайшоў ад хаткі

па схіле гары. Жураўка ўвесь час шчоўкаў фотаапаратам.

Я на ўсякі выпадак прыхапіў карабін. І мы пайшлі за мядзведзем. Як за добрым дзядзькам, які паказвае нам шлях у горы.

Ды недалёка мы адышлі ад хаткі. Белы мядзведзь нечакана павярнуў назад і, выстаўляючы перад сабою лапы, як бы махаючы кулакамі, сігануў на нас.

Страляць я не адважыўся. Шкада звера. Таму мы адступілі ў хатку.

Мядзведзь гаспадарліва пакружыў вакол нашага няхітрага збудавання. Знайшоў у пяску нейкага, магчыма, ім самім прыхаванага тухлаватага звярка. І на нашых вачах пачаў яго трушчыць.

Зноў ён пахадзіў па крузе. Наблізіўся да дзвярэй, паспрабаваў іх адчыніць. Я нацэліўся з карабіна. Але Жураўка маліў мяне не знішчаць звера.

Я стрэліў у паветра праз шчыліну. Мядзведзь як не пачуў таго стрэлу, рэха ад якога пакацілася ў горы. Ад хаткі, праўда, ён адышоў. А на службу не пускаў.



Што рабіць?

Жураўка прапанаваў кінуць дымавую шашку. Я прыадчыніў дзверы, выйшаў на паветра. Пусціў дым. Сам — да матросаў.

Мядзведзь падышоў да яе блізкавата. Пацягнуў на сябе паветра. Чмыхнуў. Стаў на заднія лапы і пярэднімі пацёр сабе нюхаўку. Крыху адступіўся назад. Патаптаўся на месцы, пафыркаў. І пайшоў ранейшай дарогай.

Мы пастаялі каля хаткі, пакуль ён не схаваўся ў гарах.

## АФРЫКАНСКАЯ АНТЫЛОПА

Гэта было на атлантычным узбярэжжы Афрыкі. Наш карабель стаяў на якары непадалёку ад невялічкага партовага горада. У вольны ад службы час мы назіралі афрыканцаў. Чорныя, худыя, паўголыя, з асляпляльна белымі зубамі ва ўсмешцы.

Днём яны працавалі або проста так сноўдаліся. Вечарам клаліся спаць на распаленым сонцам асфальце. Займалі ўсе праезды і пляцоўкі. Адзін пры адным, як нашы паўночныя маржы.

Прызнацца, ужо і абрыдзела была такая аднастайнасць. Мітусня. Ускрыкі. Смех. Сноўданне.

А то раптам афрыканцы пачалі нешта гарадзіць на лузе. Укапалі драўляныя слупы, абцягнулі металічнай сеткай вялікую травяністую пляцоўку.

Нам падумалася, што для выпасу дамашняй жывёлы. Паставілі загародку. Адно вароты расчынілі.

І дзень, і другі яна пуставала. Ды і трэці нічым асаблівым не прыцягвала тая пляцоўка.

Але надвячоркам нечакана гарадок як бы схамянуўся ад летняй спёкі, ажыў. Людзі беглі на луг. Скакалі, куляліся цераз галовы. Пляскалі ў далоні. Свісталі. Білі ў бубны.

Матрос Жураўка ўзняў бінокль. Хутка нам далажыў:



— Антылопа! Трапіла ў пастку рэдкая цяпер афрыканская антылопа!

Я з ім не пагадзіўся:

— Не можа быць! У Афрыцы поўна антылоп. Яны бегаюць чародамі. За ноч аб'ядаюць і знішчаюць, нібы саранча, цэлыя пладовыя плантацыі...

Матрос Жураўка цярпліва мяне выслухаў, сказаў са шкадаваннем:

— Даўно тое было, боцман... Цяпер афрыканцы бачаць многіх жывёл у заапарках... Выявілі вось антылопу ў наваколлі, загналі ў пастку...

Назаўтра мы сышлі на бераг, каб зблізку паглядзець на прыгожую жывёліну... Але з нас запатрабавалі плату. Тлусты афрыканец назваў такія грошы, што мы зніякавелі...

Жураўка махнуў рукою. Навошта грошы плаціць? Мы ў бінокль паглядзелі на антылопу. А свет той, платны, няхай нас чакае.

## У АКРУЖЭННІ ЛЬВОЎ

Спачатку мяне спісалі з карабля. Урачы пачулі нейкія шумы ў сэрцы. Перавялі служыць на базу.

Марскому воўку цяжка было прывыкаць да сушы. Але прывык. Не адзін я быў такі. Збярэмся, успомнім паходы, сваіх сяброў. Песні паспяваем за сталом. Адгонім нуду. Служым.

Але прыйшоў час, што спісалі мяне і з базы. Далі пенсію. Гуляй, боцман Краб! А мне так сумна. Месца сабе не знаходжу.

Што рабіць?

Паехаў я турыстам ва Усходнюю Афрыку. Столькі было сустрэч з экзатычнымі жывёламі і непаўторнымі краявідамі! Сланы, антылопы, бегемоты, леапарды, гіены... У Афрыцы шмат нацыянальных паркаў, дзе водзіцца рэдкая жыўнасць і казачная расліннасць.

Начавалі мы часцей на паветры, у спецыяльных лагерах з палатак. Не таму, што там няма гасцініц. Наадварот, у нацыянальных парках цудоўныя гасцініцы з ваннай, гарачай і халоднай вадою, кандыцыянерамі, з выдатнай абслугай. Але ўсё гэта каштуе вельмі дорага. Ды якая рамантыка з начлегу ў закрытых памяшканнях?

Пасялілі нас аднойчы на беразе возера. Цудоўная была мясцінка! Рыбка падскоквала над вадзяной роўняддзю. Пальмы прыкрывалі палатачны гарадок ад сонца.

Наша жытло было крайнім. За палаткамі пачыналіся джунглі. Яны як бы наступалі на палянку, дзе мы прагульваліся, вячэралі, адпачывалі.

Спаць ляглі позна. Усё ўдыхалі асалоду і прахалоду, слухалі непаўторныя перазовы дзікага афрыканскага птаства.

Стомленыя пераездам і гарачынёй, спалі моцна. І нечакана ўсіх нас узняў на ногі аглушальны роў ільва. А раптам ільвы галодныя? Раз'юшанае звяр'ё ў адзін момант разнясе нашу палатку...

У некаторых маіх суседзяў здавалі нервы. І яны ад жаху смяяліся.

Праз некалькі хвілін я прыйшоў у сябе, вылез з палаткі. Ліхтаром абвёў паляну. Бацюхны свет! Звыш дзесятка львоў акружалі лагер! Пераходзілі з месца на месца, рыкалі, аскальвалі белыя зубы...

Ды нечакана перад ільвамі з'явіліся людзі.

Я заўважыў белыя слупкі і бліскучую сетку.

Львы былі за агароджай лагера.

## ШАКАЛЫ

Легенды сцвярджаюць, што ў глыбокай старажытнасці шакалы, як і ваўкі, былі сябрамі чалавека. Раздзяліла і аддаліла іх змаганне за харч, за паляўнічыя ўгоддзі. Кожнага, чалавека і звера, прырода надзяляла сваёй хітрасцю.

Аднойчы мне давялося назіраць шакалаў. Выйшлі яны парачкай з чароту, павольна ішлі па мелкаводдзі заліва да чародкі дзікіх гусей. Птушкі заўважылі іх і пераляцелі ў іншае месца.

Шакалы прыпыніліся, пераглянуліся. Адзін пайшоў у ваду, дзе глыбей. Другі пабег да новага птушынага прыстанішча.

Першы схаваўся ў вадзе. Толькі зяпа чорным корчыкам тырчала над паверхняй заліва.



Другі шакал узняў у паветра гусей. Яны пакружыліся і селі на ранейшае месца. Крыху супакоіліся, падплылі да шакала ў вадзе. Ён і схапіў адну з іх. Узмахнула яна крылом, заскігатала. А шакал валок яе на бераг. Падбег сюды і яго напарнік. На паветра ўзнялося пер'е...

## ЯДАВІТЫЯ РЫБЫ

Ядавітых рыб у морах і акіянах даволі шмат. Але я буду расказваць пра тых, якіх сам бачыў.

Рыбы гэтыя розныя афарбоўкай, памерам. Мірныя. Яны ніколі не нападаюць на чалавека, як бы ведаюць, што ён сам павінен іх абыходзіць, асцерагацца.

Раняць ядавітыя рыбы з дапамогаю вострых плаўнікоў, шыпоў і калючак. Праз спецыяльныя пратокі рыбы ўпырскваюць у кроў пацярпеўшага таксіны, якія дзейнічаюць у асноўным на нервовую і кравяносную сістэмы чалавека. Некаторыя з ядаў



дзейнічаюць вельмі хутка і практычна не дазваляюць аказаць своечасовую дапамогу пацярпеўшаму.

Кожнаму трэба помніць, што прыгожае, цёплае, гаючае мора заўсёды тоіць у сабе вялікую небяспеку.

## КЕРЧАК

Знешне гэта рыба нагадвае сіняпёрку. Толькі яна меншая памерамі. І пад брушкам мае тры калючкі.

Матрос Жураўка наступіў на яе на пляжы каля горада Керчы. Ад болю завойкаў і паваліўся на пясок. Моцна крыкнуў:

— Нагу ўкалоў!Нагу!..

Падбеглі мы з матросамі. Адразу знайшлі ранкі. Ведалі пра ядавітых рыб. Дык пераціснулі нагу жгутам. Я прыпаў да нагі Жураўкі і пачаў адсмоктваць яд.

Матросы выкапалі з пяску самога керчака. З верх-

няга плаўніка жоўтымі кропелькамі-расінкамі сцякаў яд.

Жураўка папрасіў мяне, каб я аднёс рыбіну з пляжа і пусціў у мора. Я так і зрабіў.

## МАРСКІ ДРАКОНЧЫК

Матрос Жураўка чамусьці гэтую рыбку называў скарпіёнам. Магчыма, каб падкрэсліць, што яна самая ядавітая з усіх вядомых нам рыб.

Упершыню сутыкнуўся я з дракончыкам у Керчанскім праліве. Плаваў пад вадою з аквалангам і разглядаў марское дно. І ўбачыў яго галоўку з высока пасаджанымі і скіраванымі ўверх вачыма. Падхапіў рукою і — як апёкся. Вострыя калючкі пярэдняга спіннога плаўніка і шыпы жабравых крышак упіліся ў цела. Спачатку адчуў востры, гарачы боль у месцы пашкоджання. Хутчэй на паверхню!

Я адсмактаў яд з ранкі. Ледзь дабраўся да карабля. Тры дні праляжаў у кубрыку. Яшчэ доўга крываточыла рана.

Карабельны ўрач зрабіў заключэнне, што дракончык быў невялікі памерам, укалоў мяне неглыбока. У яго ядзе была нізкая канцэнтрацыя таксінаў. А так бы мог скруціць параліч.



# ЗВЯЗДАР

З ім я сустракаўся на Чорным моры і ў Ціхім акіяне. У звездара вочы на галаве — глядзяць у неба. Ніжняя сківіца закручана ўверх, як барада ў бяззубага чалавека,— як носа не дастае. Язык падобны на чарвяка, які і служыць прыманкай для іншых рыб.

У звездара на жабравых крышках і над груднымі плаўнікамі ёсць вострыя шыпы. У перыяд размнажэння на іх развіваюцца клеткі, якія выпрацоўваюць таксін. Праз разоркі на шыпах яд трапляе ў ранку.

Матросы нашы раненні звездара пераносілі лёгка. У Італіі, расказвалі, ад раненняў звездара людзі паміралі.



# МАРСКІ АКУНЬ

Налавілі мы іх таптухай. Вытраслі ў вядро. Спачатку нават не зразумелі, якія гэта акуні.

Прынеслі на камбуз. Кок запусціў у пасудзіну руку. І прысеў ад болю, крыкнуў:

— Выкідайце за борт ядавітых акунёў!

І пабег з акрываўленай рукою ў санчасць.

Мы чумічкай-чарпаком дасталі аднаго акуня з вядра, палажылі на стол, добра разгледзелі. Ядавітымі ў яго былі і верхнія, і ніжнія, і бакавыя плаўнікі.

Не ведаю, як бы сябе пачувалі, калі б начысцілі гэтай рыбы і наварылі з яе юшкі. Хоць карабельны ўрач запэўніваў, што ўсякія рыбныя яды ў варыве раствараюцца, становяцца бясшкоднымі.



## СКАРПІЁНА

Сустракалася мне ў Чорным і Азоўскім морах, а таксама ў Керчанскім заліве.

Афарбоўка скарпіёны буравата-ружовая. Спіна цёмна-бурага колеру з цёмнымі плямкамі. Жывот ружовы. Галава вялікая, крыху сплюснутая зверху ўніз. Вочы пастаўлены высока і зблізаны, як у дракончыка.

Скарпіёна любіць камяністае дно і пры слабым асвятленні нагадвае камень з водарасцямі. Адзінаццаць промняў пярэдняга спіннога, адзін брушнога і тры промні анальнага плаўнікоў маюць ядавітыя залозы. Асабліва небяспечны яд скарпіёна выдзяляе вясною. Уколы плаўніка вельмі балючыя. Яд скарпіёнаў дзейнічае на кроў. Але асаблівых ускладненняў не выклікае.

## МЫШ-ЛІРА

Якіх толькі жывых істот няма ў моры! Мыш-рыба падобная на звычайную стракзу. Сухая, рабрыстая. Верхні плаўнік тырчыць, як руля аўтамата. І ўсе плаўнікі вялікія. Хвост венікам.

Матрос Жураўка пільна яе агледзеў. І знайшоў



жоўтую кропельку вільгаці паміж галавою і тулавам.

— Няўжо яд?

— Канечне, мыш-ліра ядавітая рыба,— сказаў я.— Выкінь за борт.

Але ён дакрануўся пальцам да той кропелькі і войкнуў. Тры дні хварэў: тэмпературыў, не еў.

## СКАТ-ХВАСТАКОЛ

Рыба гэта нагадвае бесказырку з адной стужкай.

Скат-хвастакол мае ромбападобныя формы цела, якое заканчваецца тонкім доўгім хвастом з вострым, вызубленым з бакоў шыпом. Іх можа быць і два, і тры. Тут знаходзіцца яд.

Скаты вядуць донны спосаб жыцця. Зарываюцца ў пясок на мелкаводдзі і нікога не чапаюць. Актыўна абараняюцца, калі чалавек наступае: наносяць глыбокую рану сваім хвастом. Укол нагадвае ўдар тупым нажом. Боль хутка ўзмацняецца і праз колькі хвілін становіцца нясцерпным. Узнікаюць ацёкі, непрытомнасць, галавакружэнне...



## КАТРАН

Так матросы называюць калючую акулу, якая водзіцца ў Японскім і Баранцавым морах. Даўжыня яе — каля двух метраў. Збоку глядзіцца, як рэактыўны лайнер. Мае ядавітыя шыпы перад спіннымі плаўнікамі.

Зазяваўся я з аквалангам на глыбіні. І катран куляй пранёсся ля мяне, як нажом, шмаргануў шыпамі па руцэ.



Ад перапалоху ледзь выбраўся я з вады. Ды мае хваляванні былі дарэмнымі. Яд у калючай акулы вельмі слабы. Праўда, аскал яе белых вострых зубоў нярэдка мне і цяпер сніцца.

## ЕРШ-НАСАР

Рыба гэтая нагадвае звычайную плотку. Хіба толькі ў сямействе куртатых яршоў вылучаецца сваім даўгаватым носам.

Насар больш палохае сваім высокім, як плот, верхнім ядавітым плаўнікам, чым раніць ім. Хто не ведае, што гэтая рыба з ядам, той і не адчувае яго.

## АД АЎТАРА

У нашым двары ёсць ліпавая алея, валейбольная пляцоўка, хакейны каток. У гэтым, безумоўна, заслуга боцмана Краба. Не падумайце толькі, што ўсё рабіў ён адзін. Памагалі дзеці.

А дзеці любяць боцмана. Ён дазваляе прымерацца фуражку, на якой золатам гарыць марская кукарда — краб. Расказвае цікавыя гісторыі, вясёлыя і сур'ёзныя.

Вось і сёння дзеці абступілі боцмана, слухаюць...

— Было гэта ў акіяне. Звечара стыхія разгулялася не на жарт. А карабель ішоў наперад. Усю ноч.

На світанні шторм аціх. Вочы разбягаліся — такая адкрывалася прастора! За гарызонт каціліся высокія хвалі. Па небе вецер гнаў дымчатыя хмары. А за бортам карабля гайдаліся качуркі на вадзе. Столькі сабралася, што аж у вачах цёмна.

Я стаяў на палубе і любаваўся гэтымі вадзянымі птушкамі. Прыгожыя яны! Апярэнне стракатае, вясёлкавае. І даверлівыя. Праўда, я не здагадаўся, чаму яны так густа злятаюцца да карабля. Можа, галодныя?

Загадаў матросу, каб сыпануў за борт аўсянкі. Але качуркі не кінуліся на харч. Адчуваюць, значыць, нейкую небяспеку.

А хмары зноў набліжаюцца, растуць. Дыхнуў парывісты халодны вецер. На палубу ўпалі першыя сняжынкі.

Гляджу я: качуркі садзяцца на карабель. На бак, на ют, на карму... На капітанскі мосцік... Садзяцца на рэі і антэны... Нават мне на плечы, на галаву... Адну змахнеш — адразу дзве месцяцца.

А снег ужо валіць. Густы-густы! Вада за бортам як месіва. З гэтага месіва з цяжкасцю вырываюцца качуркі. Садзяцца і садзяцца на карабель. Сотнямі...

Я пайшоў да камандзіра. Адчыніў дзверы рубкі, а зачыніць не паспеў. І сюды з прарэзлівым крыкам палезлі качуркі.

Камандзір даў каманду застопарыць машыны, і карабель лёг у дрэйф.

Толькі пасля абеду крыху распагодзілася. Нават сонца выглянула з-за хмар, зрэдзіла снежнае месіва. І качуркі пачалі злятаць за борт, рассейвацца ў акіяне. Некаторыя доўга кружыліся ў паветры, нібы развітваліся з намі, дзякавалі за выратаванне...

Боцман Краб змоўк. І дзеці з палёгкай уздыхнулі. Доўга яшчэ сядзелі яны моўчкі, не разыходзіліся. Хаця і ведалі, што боцман кожны дзень расказвае толькі адну гісторыю.

# ЗМЕСТ


Пелікан . . . . . . . . 3
Глафіра . . . . . . . . 6
Скапа . . . . . . . . . 8
Бакланы і бабуры . . . 11
Кайры . . . . . . . . 12
Жураўлі і Жураўка . . 14
Ластаўкі . . . . . . . 16
Гагаркі . . . . . . . . 18
Хмарка над акіянам . . 19
Куранятка . . . . . . 21
Макака . . . . . . . . 23
Рыжая хітруга . . . . 24
Птушыны рох . . . . . 26
Агністыя гусі . . . . . 27
Галодныя арлы . . . . 29
Бычыны рог . . . . . 30
Белы дадо . . . . . . 32
Курачкі-султанкі . . . 33
Дрэва без каранёў . . . 34
Качканос . . . . . . . 35
Прыліпалы . . . . . . 38
Сівы шчупак . . . . . 40
Жывая тарпеда . . . . 41
Марскі мянтуз . . . . 43
Белы вугор . . . . . . 44
Рыба-блін . . . . . . 46
Тыгрыца . . . . . . . 47
Ці спяваюць рыбы? . . . 49
Падземныя рыбкі . . . 51
Марскія дрэваточцы . . 52
Марскі музей . . . . . 53
Дэльфіны . . . . . . . 55
Коцікі . . . . . . . . 57
Сівучы . . . . . . . . 59
Гарбуны . . . . . . . 60
Кіт і чайка . . . . . . 62
Выратаванне коціка . . 63
Лахтак . . . . . . . . 63
Каланы . . . . . . . . 64
Акіба . . . . . . . . . 65
Дзіўны краб . . . . . 66
Краб і актынія . . . . 68
Сіняпёрка . . . . . . 68
Загадка Антарктыды . . 69
Цуд тропікаў . . . . . 70
Эўкаліптавы чэмпіён . . 71
Валодзька з «Бездакорнага» . . . . . . . . . 74
На «Ташкенце» . . . . 76
Белы мядзведзь . . . . 79
Афрыканская антылопа 81
У акружэнні львоў . . . 83
Шакалы . . . . . . . . 84
Ядавітыя рыбы . . . . 85
  Керчак . . . . . . . 86
  Марскі дракончык . . 87
  Звяздар . . . . . . . 88
  Марскі акунь . . . . 89
  Скарпіёна . . . . . . 90
  Мыш-ліра . . . . . . 90
  Скат-хвастакол . . . 91
  Катран . . . . . . . 92
  Ёрш-насар . . . . . 92
  Ад аўтара . . . . . 93

Литературно-художественное издание

**МЫСЛИВЕЦ Валентин Тимофеевич**

**РАССКАЗЫ БОЦМАНА КРАБА**

**Из наблюдений морского путешественника**

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

**МЫСЛІВЕЦ Валянцін Цімафеевіч**

**РАСКАЗЫ БОЦМАНА КРАБА**

**Зназіранняў марскога падарожніка**

Рэдактар
*М. М. Зарэмба*

Мастацкі рэдактар
*У. М. Жук*

Тэхнічны рэдактар
*Г. Ф. Дуброўская*

Карэктар *Л. К. Паплаўская*

Здадзена ў набор 23.01.92. Падпісана да друку 19.07.93. Фармат 60×90 1/16. Папера кн.-журн. Гарнітура Школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 6,0. Ум. фарб.-адб. 24,5. Ул.-выд. арк. 4,46. Тыраж 20 000 экз. Зак. 260.

Выдавецтва «Юнацтва» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 7. 220600, Мінск, Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўскага, 20.

Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

